КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 12 (1190) 21 сакавіка 2015 г.

СКАРБЫ З VIII СТАГОДДЗЯ

У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі пачала працаваць унікальная выстаўка ўнікальных рарытэтных збораў. На ёй прадстаўлена 38 скарбаў, знойдзеных у рэгіёне ў розныя гады.

На здымках: фрагмент экспазіцыі і грашовараўчыўны скарб VIII — пачатку IX стагоддзяў, знойдзены ў 1962 годзе на Ліёзненшчыне. Фота Таццяны КАЛЕСНІКАВАЙ

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Рэпарцёрскі марафон

Добраўпарадкаванне альбо... тарнада?

Які лёс чакае старадаўнія могілкі ў Дзяржынску?

Пытанне, што рабіць са старымі могілкамі, наўрад ці мае простыя і адназначныя адказы. З аднаго боку — гісторыя, памяць, продкі... З адваротнага — мноства цалкам практычных праблем. Галоўная з іх відавочная: хто павінен даглядаць за тымі магіламі, што спрэс параслі хмыззём, бо сваякі нябожчыкаў даўно згубіліся ў вялікім свеце?

У Дзяржынску мясцовыя ўлады самі пачалі захады па добраўпарадкаванні старых могілак, але гэтая ўхвальная ініцыятыва ўвасаблялася такім чынам, што некаторыя жыхары горада чамусьці палічылі яе... актам вандалізму. Пра што і сталі паведамляць на рэдакцыйныя акаунты ў сацыяльных сетках. Неўзабаве журналіст "К" атрымаў заданне выехаць на месца падзей...

Ілья СВІРЫН,
Мінск — Дзяржынск — Мінск / Фота аўтара

Навошта турбаваць продкаў?

Сёння пагост у Дзяржынску выглядае зусім несамавіта — як быццам па ім прайшоўся тарнада. Большасць надмагілляў выдзернутыя з зямлі і грувасцяцца купамі, некаторыя — пашкоджаны альбо зламаны... Відавочна, прычынай таму — зусім не стыхія, і нават не няўмольны час, а менавіта антрапагенны фактар. Пры тым, што апрача звыклых жалезных крыжоў, тут можна адшукаць і камяні ды пліты, усталяваныя яшчэ ў XIX стагоддзі. Чытаючы надпісы на іх, міжволі задаешся пытаннем: а хто былі гэтыя людзі? Аднак добра ўквэцаўшыся ў гразь, адразу прыпыняеш меланхалічна-філасофскія роздумы. Відавочна, цяперашні стан могілак з'яўляецца часовым. Але якім ён мае стаць у выніку?

Клады з больш як двухсотгадовай гісторыяй вось ужо амаль паўстагоддзя лічацца нядзейнымі — прыкладна столькі часу тут не хаваюць. Зразумела, значная частка магіл нікім не даглядаецца. Але, як выявілася, далёка не ўсе.

— Мне ўжо шэсцьдзесят, а ўпершыню мы з бацькам сюды прыйшлі, калі я такі во быў, — рука мясцовага жыхара Міхаіла Лагуновіча апускаецца недзе на ўзровень калена. — І цяпер я старэйшы ў родзе застаўся — адпаведна, мне за нашымі пахаваннямі і сачыць.

Прозвішча "Лагуновіч" сустракаецца на магільных камянях даволі часта — раз-пораз нават яшчэ з дарэвалюцыйнымі "яцямі". А ёсць жа таксама і пахаванні крэўных, што мелі іншыя прозвішчы, магілы сяброў і суседзяў... Міхаіл Іванавіч захаваў успаміны пра кожнага з іх, і ягоны расповед становіцца своеасаблівай экскурсіяй па Койданаве — яшчэ не Дзяржынску — мінулага.

Гэта апошні стары пагост у Дзяржынску. Ад астатніх не засталося і следа. Прыкладам, на месцы яўрэйскіх могілак яшчэ за савецкім часам паўсталі жылыя дамы. Паводле койданаўскіх пагалосак, жывецца там людзям не надта добра, асабліва, калі ім даводзіцца праводзіць земляныя работы...

— Уласна, хрысціянскія могілкі некалі пацярпелі ўжо ад вандалізму ўладаў, — распавядае старшыня грамадскага аб'яднання "Кальварыя" Уладзімір Адамчык. — Калі будавалі дарогу на Рубяжэвічы, частка пахаванняў была знесена. Вядомы пісьменнік і мастак (яго творчы псеўданім — Адам Глобус), які ганарыцца койданаўскім паходжаннем ды цягам дзесяцігоддзяў метадычна адлюстроўвае ў сваіх творах мінуўшчыну гарадка, тут жа прызнаецца: на гэтых могілках пахаваны і яго сваякі. Напэўна, тое самае маглі б сказаць і многія іншыя карэнныя жыхары...

Яшчэ гадоў пятнаццаць таму стары пагост падаваўся сапраўдным гаем, але хтосьці "праявіў руплівасць", і вялікія дрэвы спілавалі. Як неўзабаве выявілася, тое — стратэгічная памылка: ад промняў сонечнага святла на могілках раскашавала хмыззё, пераўтвараючы іх улетку ў непралазныя джунглі. Зразумела, з гэтым трэба было нешта рабіць... І вось, у ліпені мінулага года пачаліся "мерапрыемствы па добраўпарадкаванні", якія дасягнулі свайго апагею ў кастрычніку.

— Па сутнасці, нас проста паставілі перад фактам, — распавядае Міхаіл Лагуновіч. — Зранку я праходзіў міма — нібыта, усё як было. А ўвечары — немаведама што! Агароджы пазносілі, крыжы і пліты купамі на зямлі валяюцца... Яўна тэхніка працавала. Я "сваіх" з тых купаў павыцягваў, вярнуў на месцы. І накіраваў зварот у пракуратуру....

Заканчэнне артыкула **чытайце на старонцы 2.**

9 771994 478007 15012

18 канцэртных праграм запланавана правесці на сёлетнім "Славянскім базары ў Віцебску", продаж білетаў на які ўжо распачаўся.

Дэтальны разгляд

Творча-плённае паветра

На маю думку, Год культуры мусіць быць... заўжды.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

І мне падаецца вялікай праблемай тое, што наша грамадства адчувае патрэбу ў беларускай культуры толькі ў пэўныя дні і святочныя даты. Што, да прыкладу, яшчэ да гэтай пары пэўныя з нас называюць недагледжаныя помнікі архітэктурнай спадчыны — развалінай. І замест таго, каб паспрабаваць захаваць той помнік, выносяць старую цэглу ды нават выдзіраюць з дапамогай адпаведнай машыны з будынку аўтэнтычныя лесвіцы. Навошта? Сабе на лецішча.

Так, змяняць трэба штосьці ў галавах. І, напэўна, пачынаць варта з дзіцячага садка, школы, — дзе істотнае месца аддавалася б вывучэнню гісторыі роднага краю, гісторыі беларускай культуры ў кантэксце сусветнай. Працягваць выхаванне праз медыя, якія наперабой распавядалі б пра здабыткі старажытнай і сучаснай культуры Беларусі з такім жа імпэтам, як пра выбітныя спартыўныя вынікі Дар'і Домрачавай. Па-трэцяе, заахвочваць грамадства да самавыяўлення і спрыяць яму праз стварэнне адкрытых пляцовак для выступленняў і творчасці. Бо без магчымасці ствараць нічога і не ствараецца.

Мне падаецца, галоўная праблема, якая адчуваецца многімі ўдзельнікамі культурнай прасторы ды ўсімі грамадзянамі сёння — гэта брак менавіта творча-плённага паветра, якое давала б адчуванне натхнення і імпэту. Большасць людзей, на маю думку, пачувае сябе закрытымі, не ведаючы, што адбывалася нават у сваім двары, не кажучы пра суседні. Таму ўсё, чаго я магу жадаць у Год культуры — пашырэння адкрытай камунікацыі.

> ...Заахвочваць грамадства да самавыяўлення і спрыяць яму праз стварэнне адкрытых пляцовак для выступленняў і творчасці. Бо **без магчымасці ствараць нічога і не ствараецца**.

І адкрытасці дзяржаўных інстытутаў да ініцыятыў, якія, ідучы нават з самых "нізоў", будуць садзейнічаць стварэнню прасторы вольнай творчасці і павагі да ўласнай культуры.

А калі — Год культуры...

На выніковай калегіі Міністэрства культуры краіны агучана ідэя абвяшчэння 2016-га Годам культуры. Мы вырашылі ўнесці ў скарбонку прапаноў да гэтай ініцыятывы і свае развагі, якія друкуем цягам некалькіх нумароў. Запрашаем падзяліцца меркаваннямі і чытачоў!

Вырашыць будзённыя клопаты

З нагоды тых ці іншых вялікіх акцый у нас ёсць завядзёнка рэалізоўваць нейкія маштабныя і, зразумела ж, дарагія праекты. Але паколькі наступны год — без залежнасці ад свайго афіцыйнага дэвізу — хутчэй за ўсё, будзе таксама і "годам эканоміі", куды больш істотна сканцэнтраваць усю ўвагу і рэсурсы на вырашэнні тых "бягучых" праблем, якія не спрыяюць сістэмнаму ўдасканальванню працы галіны. А назапасілася іх даволі.

Ілья СВІРЫН

Прыкладам, у юрыдычнай сферы. Возьмем хаця б такі аспект, як прыватная ініцыятыва. У нас яна, вядома, толькі вітаецца, але... Ні на якія асаблівыя ільготы прыватніку пакуль разлічваць не выпадае. Пры тым, што рэнтабельнасць мастацкай галерэі не можа быць гэткай самай, як масажнага салона, а якасная рэстаўрацыя каштуе даражэй за новае будаўніцтва. Вось таму галерэй у нас зусім вобмаль, а замест аднаўлення гістарычных сядзіб інвестары будуюць новыя ў стылі "аграгламуру".

Бадай самая актуальная для грамадства праблема ў сферы культуры — ахова спадчыны. Эмоцыі тут ужо каторы год — цераз край, а вось агульнага разумення, што і як трэба (ці, дакладней, магчыма) зрабіць для выпраўлення сітуацыі, пакуль бракуе. Як падаецца, такая канцэпцыя сфармавана акурат у Міністэрстве культуры краіны, і прадугледжвае яна паўсюдныя і паслядоўныя захады па кансервацыі закінутых помнікаў — ізноў жа, па меры магчымасці... Але пакуль воз, як кажуць... Тое самае тычыцца і прапанаванай спецыялістамі Міністэрства рэформы сістэмы аховы спадчыны, якая ўжо атрымала станоўчую "візу" аўтарытэтных спецыялістаў.

Урэшце, немагчыма абмінуць увагай і ці не самую злабадзённую тэму для самой галіны — заробкі. Калі прафесіянал, а тое і ўвогуле ўнікальны ў сваім родзе творца, атрымлівае менш за грузчыка ў супермаркеце, гэта немінуча прыводзіць да згубных для ўсяго грамадства вынікаў. Скажам, кадры... Пакуль праблема з імі яшчэ не надта адчувальная — "старая гвардыя" мужна трымае пазіцыі. Але прыкметнае зніжэнне конкурсу ў творчыя ВНУ не можа не насцярожваць. А гэта — будучыня...

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГА (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Вольга НАВІЦКАЯ; **рэдактары аддзелаў:** Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Аліна САЎЧАНКА; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Інга ЗЕЛЬГІС.

Сайт: **www.kimpress.by** E-mail: **kultura@tut.by** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА" 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2015. Наклад 5 818. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 20.03.2015 у 18.00. Замова 1099. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Рэпарцёрскі марафон

Добраўпарадкаванне альбо... тарнада?

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

...Па яе патрабаванні працы былі прыпынены, і клады "застылі" ў сваім цяперашнім выглядзе. Натуральна, паўстала пытанне: а што далей? Неўзабаве па горадзе папаўзлі чуткі пра меркаваны перанос могілак, падмацаваныя нейкімі абвесткамі, нібыта, за подпісам "Дзяржынская ЖКГ" (копію адной з іх мне прадэманстраваў Міхаіл Лагуновіч). У тэксце ўтрымлівалася і фраза "перапахаванне астанкаў", а таксама нумар тэлефону, на які прапаноўвалася звяртацца зацікаўленым сваякам.

Насамрэч, паводле дзейнага заканадаўства, перанесці могілкі можна хіба ў выпадку "надзвычайных сітуацый прыроднага альбо тэхнагеннага характару", якія, хвала Усявышняму, у Дзяржынску даўно не здараліся. Але, як сведчаць свежыя яміны на пагосце, нехта ўжо паспеў перапахаваць сваякоў. А вось Міхаіл Лагуновіч адмовіўся наадрэз.

— "Маіх" тут болей за дваццаць магіл, дык як я дам сабе рады іх перанесці? — задаецца ён пытаннем. — Ды і... навошта? Мая бабуля, калі памірала ў 1959 годзе, завяшчала пахаваць яе тут. Дык чаму я павінен турбаваць нябожчыкаў?

Так выглядаюць дзяржынскія могілкі.

Крытэрыі "дагледжанасці"

Як запэўніла мяне намеснік генеральнага дырэктара ўнітарнага прадпрыемства "Дзяржынская ЖКГ" Валянціна Марчук, ніякіх "прымусовых" перапахаванняў няма і ніколі не будзе — толькі па ўласным жаданні сваякоў. У той самы час на могілкавай дошцы аб'яў з'явілася паведамленне, дзе камунальнікі "ў чарговы раз нагадваюць" сваякам пра іх права перапахавання сваіх блізкіх, а таксама тлумачаць некаторыя дэталі будучай рэканструкцыі.

У ліку захадаў па добраўпарадкаванні прадугледжаны не толькі ачыстка тэрыторыі могілак ад хмызэя і карнявой сістэмы ды пасеў газоннай травы, але таксама і "знос каменных надгробкаў з недагледжаных магіл, агароджаў з дагледжаных і недагледжаных магіл, знос крыжоў з недагледжаных магіл". І далей: "Знятыя з недагледжаных магіл каменныя надгробкі, не запатрабаваныя сваякамі, будуць пахаваныя на тэрыторыі могілак. Надгробныя камяні на магілах, за якімі даглядаюць сваякі, застануцца на месцах пахаванняў".

Больш за ўсё тут бянтэжыць слова "недагледжаны". Якія яго паняційныя межы, якія крытэрыі ацэнкі?

— У цяперашнім заканадаўстве такое паняцце адсутнічае, — тлумачыць намеснік старшыні Беларускага камітэту ICOMOS Цімафей Акудовіч. — Гутарка вядзецца толькі пра надмагільныя збудаванні, якія не падлягаюць рамонту. Тэрмін, пагадзіцеся, таксама вельмі расплывісты, але, тым не менш... Паводле закона, неабходна спярша апавясціць сваякоў нябожчыка — скажам, павесіўшы на магілцы адпаведную шыльду, — потым пачакаць два гады, і калі надмагілле за гэты час не будзе прыведзена да ладу, яго належыць замяніць на ідэнтыфікацыйны знак — таблічку з інфармацыяй пра пахаваную тут асобу.

Найбольшыя пытанні ў дадзеным выпадку выклікаюць надмагіллі, што з'явіліся яшчэ ў мінулыя стагоддзі. Тут амаль у ста працэнтах выпадкаў на сваякоў спадзявацца не выпадае — дзе яны цяпер? Зрэшты, у Дзяржынску ўжо быў апрабаваны варты пераймання алгарытм дзеянняў. Неабыякавыя да гісторыі жыхары, а таксама вядомы скульптар Ігар Засімовіч сваімі высілкамі і коштамі аднавілі зруйнаваны помнік самай вядомай асобе з пахаваных на могілках — доктару медыцыны Віленскага універсітэта Юзафу Абламовічу.

— І вось, не так даўно выявілася, што ў Польшчы жыве ягоны праправунук, — распавядае адна з удзельніц гэтага пачыну Вераніка Матусевіч. — Ён не ведаў, дзе магіла яго продка, шукаў яе ў Негарэлым, якім калісьці валодалі Абламовічы. А зараз, калі надарыцца магчымасць, збіраецца сюды прыехаць.

Суразмоўца спадзяецца, што з часам і некаторыя іншыя старыя магілы перастануць быць "безгаспадарнымі" — калі яны, вядома, застануцца на сваіх месцах...

Могілкавая эстэтыка?

Занепакоенасць краязнаўцаў і некрапалістаў лёгка патлумачыць — асабліва пасля таго, як яны прачыталі на той самай дошцы аб'яваў наступны сказ: "У далейшым на могілках для ўвекавечвання памяці памерлых і пахаваных людзей прадугледжваецца ўстаноўка памятнага знаку з таблічкамі, дзе будуць занесены іх прозвішчы..." Клады — гэта своеасаблівы помнік сваёй эпохі, і ўжо хаця б таму пахіленыя пліты з "яцямі" наўрад ці можна замяніць на сучасны мемарыяльны знак. Бо замена будзе неадэкватнай.

Зрэшты, казаць пра гэта, відавочна, зарана. Да нядаўняга часу характар запланаванай рэканструкцыі падаваўся даволі няпэўным. Цяпер захады мясцовых улад ужо прынамсі маюць вызначанае рэчышча. Як паведаміла Валянці-

У Нацыянальным мастацкім музеі з 24 сакавіка — выстаўка твораў сакральнага мастацтва да 80-годдзя **Мітрапаліта Філарэта.**

на Марчук, заключаны дагавор з праектнай арганізацыяй, якая атрымала немалы досвед добраўпарадкавання такіх спецыфічных аб'ектаў, як могілкі. Праца ландшафтных дызайнераў яшчэ не завершана, але агульны падыход вызначаны ад пачатку.

— Без сумневу, могілкі застануцца могілкамі, хаця і набудуць прыгожы сучасны выгляд, — кажа Валянціна Марчук. — І пры гэтым ставіцца задача абавязкова захаваць тыя пахаванні, якія маюць гістарычную каштоўнасць альбо даглядаюцца сваякамі. Магчыма, надмагіллі давядзецца на нейкі час зняць, каб выраўняць пляцоўку. Але потым яны вернуцца на свае месцы.

Перад захадамі па наданні могілкам эстэтычнага выгляду неабходна вырашыць чыста "тэхнічную" задачу — ачысціць тэрыторыю ў паўтара гектара ад карнявой сістэмы. Па словах Валянціны Марчук, зрабіць гэта без дапамогі спецтэхнікі практычна немагчыма.

Які лёс чакае старадаўнія могілкі ў Дзяржынску?

— Але ніякіх пераносаў магіл і стварэння групавых пахаванняў не будзе, — запэўнівае яна. — Хіба што, можа, камусьці давядзецца адмовіцца, скажам, ад агароджаў...

Вярнуць "усё як было" збольшага магчыма — яшчэ да пачатку "бульдозернай рэканструкцыі" койданаўскі энтузіяст Андрэй Бараноўскі зрабіў падрабязны вопіс пахаванняў ды іх фотафіксацыю. Па словах Валянціны Марчук, напрацоўкі мясцовых гісторыкаў і краязнаўцаў абавязкова будуць улічвацца пры стварэнні праекта.

...Напэўна, не ў мяне аднаго зачапілася вока за выраз "прыгожы сучасны выгляд". Ці прымяняльны ён у дадзеным выпадку? Ці настолькі тут важны эстэтычны аспект? Гэтае і многія іншыя датычныя старых могілак пытанні (уключна са стаўленнем да "забытых" сваякамі магіл) пакуль што з'яўляюцца дыскусійнымі, і думкі сустракаюцца самыя розныя... Ды і ўвогуле, пытанняў тут пакуль значна больш, чым адказаў.

Як запэўніла Валянціна Марчук, перад пачаткам увасаблення праект рэканструкцыі пройдзе стадыю шырокага грамадскага абмеркавання. Напэўна, менавіта з гэткага "веча" варта заўсёды пачынаць падыход да такой вельмі няпростай тэмы, як рэканструкцыя могілак. А потым ужо —спецтэхніка...

■■■

Адметна, што добраўпарадкаванне могілак прымеркавана да святкавання чарговага юбілею Дзяржынска-Койданава. Лічба ўнушае павагу — 870 гадоў!

"Апрача сваёй старажытнасці Койданава нічым іншым не вызначаецца," — пісаў у свой час Уладзіслаў Сыракомля. За прамінулыя паўтара з гакам стагоддзі адметнасцяў яшчэ паменела: ад найважнейшай з іх — кальвінскага збору — засталося хіба пару каменьчыкаў. Па вялікім рахунку, толькі паасобныя камяні і сведчаць пра даўні век ды багатую гісторыю цяперашняга спадарожніка Мінска, які жыве сваімі сучаснымі дынамічнымі рытмамі. І большасць з тых камянёў — менавіта надмагільныя помнікі.

— Безумоўна, мы будзем вельмі ўважліва і асцярожна падыходзіць да гэтай тэмы, разумеючы яе значнасць для нашага грамадства, — запэўнівае галоўны спецыяліст аддзела ідэалогіі, культуры і па справах моладзі Дзяржынскага райвыканкама Ніна Жэндзерава. — І тут галоўнае — не нашкодзіць...

К

ф о т а ф а к т

Беларускі "M.@rt..."

Сёння ў Магілёве стартуе Міжнародны маладзёжны тэатральны форум "M.@rt.-кантакт-2015". Беларусь на гэтым прэстыжным, дзясятым па ліку, аглядзе прадставяць спектакль гаспадароў фэста, Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра, "Жаніцьба", пастаноўка Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра "Палкоўнік-птушка" і работа Цэнтра эксперыментальнай рэжысуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў "По имени Господин".

Фота прадастаўлена тэатрамі

Зваротная сувязь: рэплікі і каментарыі

"У чым разбіраюцца ўсе?" / №8

Dzianis Kuchynski:
"Ох, як жа слушна! Усе ўсё ведаюць лепш за астатніх!"

Irena Hanetskaja:
"А я думала, што ўсе разбіраюцца толькі ў археалогіі, гісторыі і медыцыне. Выходзіць не толькі. У гэтым сэнсе заўсёды зайздросціла астрафізікам".

Eugenio Krasulin:
"Даводзілася сустракаць маладых журналістаў, якія сваю карціну свету чэрпаюць з рускамоўнай Вікіпедыі. І пры гэтым "старшыя таварышы" ад іх у замілаванні... Але надзею нараджае тое, што знайсці інфармацыю замала. Трэба яе сістэматызаваць, прааналізаваць, зрабіць высновы, а потым сістэматызаваць яшчэ і высновы. Толькі тады гэта будзе цікавым. А той, хто гоніць вал інфатрэшу, хутка згубіць увагу з боку публікі".

Taciana Tulus:
"Яшчэ ўсе разбіраюцца ў педагогіцы і методыцы выкладання прадметаў і навук".

Anna Kislitsyna:
"Неяк мне распавядалі, што маладая амбітная журналістка, якая рабіла смешныя памылкі і блыталася ў замежных словах, атрымала працу ў прэстыжным СМІ, кіраўнік якога — вельмі прафесійны журналіст са стажам і вопытам. Натуральна, спытала ў таго, хто паведаміў мне гэтую навіну, а як журналістцы гэта ўдалося? Адказ быў нечаканы: "Разумееш, кіраўнік, які браў яе на працу, да ўсяго яшчэ і паэт. І вось яна лайкала яго вершы, лайкала — і далайкалася да месца..." Дзеля справядлівасці скажу, што яна нядоўга там пратрымалася. Але эпізод у тэкст не трапіў..."

"Экскурсіі ў... СДК" / №10

Лилия Горбунова:
"Вось так. Думаю, што ў Баранавічах пра яго, гэты музей, мала хто ведае. Нездарма ж гавораць: "Хто б ведаў бусла, каб не яго дзюбка". Вельмі важна пісаць, распавядаць і дзяліцца тым, што бачыш. Памятаю, у мясцовай газеце быў змешчаны артыкул пра Юрыя Пшаўлоцкага. А яшчэ ведаю, што ягоны родны брат Станіслаў кіруе народным тэатрам "На Мышанцы" ў Новай Мышы. Карацей, таленавітая сям'я!"

Музей: канцэпцыя перспектыў / №10

Grigory Borovik:
Пагаджуся з Алегам Рыжковым: "Нам патрэбны змены. Вы паглядзіце на нашы цэнтральныя вуліцы — адны адміністрацыйныя будынкі: банкі, офісы. А павінны быць музеі, якія б стваралі імідж дзяржавы, рознабакова распавядаючы пра гісторыю Беларусі".

Хто ты, сучасны бібліятэкар? / № 7

Irina Golubzowa:
"Моладзь, канешне, не так масава, як хацелася б, у прафесію ідзе. Тое цалкам зразумела. А бібліятэкарам, незалежна ад іх узросту, неабходна ўсё ж крочыць у нагу з часам і ўпэўнена валодаць камп'ютарнымі тэхналогіямі. Урэшце, сорамна і нават недапушчальна не ўмець знаходзіць інфармацыю ў Сеціве. І мерапрыемствы без камп'ютарных прэзентацый, без відэашэрагу я даўно не праводжу".

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby**

Фотасюжэт нумара

ТЮГ у працэсе!

Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача ўсё бліжэй да таго моманту, калі ён гасцінна расчыніць дзверы перад аматарамі сцэнічнага мастацтва. Нашы карэспандэнты змаглі першымі з журналістаў зазірнуць у абноўлены будынак. Сёння прапануем вашай увазе фотасюжэт з гэтага аб'екта, а ў наступных нумарах — чытайце рэпартаж з ТЮГа.

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

У Прэзідэнцкай бібліятэцы выстаўляюцца работы навучэнцаў і педагогаў **Мірскага дзяржаўнага мастацкага прафтэхкаледжа**.

Дзяжурны па нумары

Прастора і плюшч

У многіх установах культуры, дзе даводзіцца бываць журналістам "К", як мантру паўтараюць, апроч тэмы нізкіх заробкаў: "Нам бы памяшканні, каб разгарнуцца…". Прычым не стае прасторы бібліятэкам, клубам, школам мастацтваў, цэнтрам рамёстваў.

Аліна САЎЧАНКА

Мне падумалася, а ці шмат яе, той прасторы, карыснай ва ўсіх сэнсах плошчы, патрэбна для творчасці? Гэтым пытаннем я задалася пасля наведвання Квасыніцкага цэнтра рамёстваў пад Слуцкам. Установа абслугоўвае багата школьнікаў з вакольных паселішчаў, а таксама аб'ядноўвае дарослыя рамесніцкія сілы. Будынак установы немаленькі: панэльны, аднапавярховы, налічвае некалькі памяшканняў пад класы-майстэрні, а таксама кабінет дырэктара і прахадныя пакоі ды калідоры. Апошнія выкарыстаны прагматычна: з іх атрымаліся выставачныя галерэі. Праходзячы, не абмінеш рукачыннай прыгажосці. А дэманстраваць у Цэнтры рамёстваў ёсць што!

Па прызнанні дырэктара ўстановы Наталлі Матусевіч, плошчаў бракуе асабліва для захоўвання работ. Па сутнасці, некаторыя ж з іх становяцца ўзорнымі для новых пакаленняў навучэнцаў, экспанатамі для выставак. Дарэчы, цэнтр ужо спазнаў пераезд: сённяшні будынак выдзелілі ўстанове з дзясятак гадоў таму, як больш зручны і прасторны. І майстры яго хутка асвоілі ды ўпарадкавалі на свой лад.

Такое "разрастанне" нагадвае мне прыроду паводзін плюшча. Не атрутнага, крый божа, а вечназялёнага і пяшчотнага. Нездарма плюшч быў улюбёнай раслінай аднаго з найвядомых мастакоў у гісторыі — Ван Гога. Апошні, як вядома, працаваў, змагаючыся з нястачай. Тым не менш, майстар пакінуў па сабе такую спадчыну, што кожнаму музею, прынамсі, хопіць па карціне.

Прыклад для таго, каб зразумець: дык ці з'яўляюцца камфорт, дадатковыя метры і грошы гарантамі прадуктыўнасці ў галіне культуры. А тым часам усё часцей чуеш ад работнікаў сферы скаргі менавіта на гэты, побытавы, бок іх дзейнасці. Ды складанасці такога парадку, мяркую, могуць прывесці не да стагнацыі, а да мабілізацыі творчых сіл і здольнасцей. І — да прыкметных вынікаў. Цесна ў памяшканнях? Можна выйсці ў прастору іншай установы, на прадпрыемства, на вуліцу са сваімі праектамі. Але ж, з іншага боку, не культываваць жа беднасць устаноў у рэгіёнах як норму і прынцып дзеяння… Карацей, цікава было б пачуць меркаванні і ад чытачоў…

Аднак нярэдкія і такія выпадкі, калі (цяпер не пра Квасынічы) проста не разумееш, што менавіта зойме гэтае чаканае "свята месца", у чым арыгінальнасць установы, якая ўсё патрабуе і патрабуе чагосьці, скардзіцца ды скардзіцца. Вось чым выстаўка ў гіпатэтычнай музейнай зале № 2, якая так патрабуецца, будзе якасна адрозніваца ад экспазіцыі ў зале № 1? Або няўжо памяшканне меркаванай новай "чыталкі" ў бібліятэцы станецца запатрабаваным за кошт правядзення чарговай кніжнай выстаўкі? Не заўсёды бачыш выразны вынік і навацыі ў бягучай дзейнасці, далёка не заўжды здзяўляюць арыгінальнасцю планы работы на перспектыву, нават фантазійна-аддаленую, дзе ўжо, падаецца, можна разысціся і панабудаваць праектаў. Ды і інвестар пагодзіцца размаўляць толькі тады, калі перад ім пакладуць канкрэтны бізнес-план. Ці хаця б які-небудзь план. А так спрацоўваюць хіба "дацкія" нагоды па спансіраванні з "дацкай" жа "абавязалаўкай" на выхадзе.

Так, у нашых рэаліях неабходна прыцягваць увагу, натхняць і пераконваць спонсараў ці дзяржаўныя інстытуцыі: нічога, настолькі ж каштоўнага, як культура ў якасці складніка ідэалогіі, не знайсці. А калі не атрымоўваецца абгрунтаваць праект, дык мо варта выдатковаць больш часу на падрыхтоўку свежай задумы. А ўрадлівая творчая глеба ды мастацкі клімат, можа, і не такія ўтапічныя, як падаецца? Тым больш, што метафарычны плюшч не такая ўжо і патрабавальная расліна. Яму ж патрэбны здаровы корань, правільны кірунак росту і надзейная апора. Як гэты працэс нагадвае культурнае станаўленне і развіццё...

К

Маўр зрабіў сваю справу — і ўсё?

Гісторыя бібліятэкі: абласная — філіял — аддзел…

Усё пачалося з ліста пенсіянеркі з Мінска, колішняга педагога Інэсы Ігнацьеўны Раткевіч. Мае сэнс прывесці тут яго фрагменты:

"…Закрылі Дзіцячую бібліятэку імя Янкі Маўра, якая знаходзілася па Казлова, 12. Камусьці спатрэбілася памяшканне ў цэнтры горада — і бібліятэчную шыльду выдралі з коранем… Пасля Вялікай Айчыннай вайны, калі горад быў разбураны, аднаўленне пачалося з клопату аб дзецях. А праз 70 гадоў пасля Вялікай Перамогі на гэты клопат забыліся і дзіцячую ўстанову перавялі ў Абласную бібліятэку імя Пушкіна. Трэба наадварот адкрываць новыя дзіцячыя бібліятэкі, выхоўваць маладое пакаленне, ад якога залежыць дабрабыт дзяржавы…"

Яўген РАГІН

Пачнём разбірацца ў праблеме. Пэўны час дзве абласныя бібліятэкі — імя Аляксандра Пушкіна і дзіцячая — існавалі паралельна. Пасля смерці Янкі Маўра прынята рашэнне ўвекавечыць памяць пісьменніка. Яго пашанотнае імя і было прысвоена абласной дзіцячай кніжніцы ў 1972-м. А паколькі аптымізацыя ў сферы культуры — з'ява перыядычная, дык у 1989 годзе Пушкінская аб'ядналася з Маўраўскай. Як сцвярджалі цыркуляры таго часу, бібліятэчная інтэграцыя спатрэбілася для "больш эфектыўнага выкарыстання матэрыяльна-тэхнічнай базы, бібліятэчна-інфармацыйных рэсурсаў і фінансавых сродкаў". Тады ўстанова імя Янкі Маўра і стала філіялам бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна. А ў выніку апошняга аптымізацыйнага ператрусу дзіцячая ўстанова (а больш дакладна — аддзел абслугоўвання навучэнцаў 1 — 5 класаў) пераехала з Казлова ў асноўны будынак Пушкінскай на Гікала і стала (аб'яднаўшыся з аддзелам абслугоўвання навучэнцаў 6 — 9 класаў) дзіцячым аддзелам абласной бібліятэкі.

Цяпер самы час паразважаць над глыбокадумнасцю выказвання "Хтосьці губляе, а хтосьці знаходзіць". Згубілі, натуральна, тыя чытачы, што жылі побач з памяшканнем на Казлова. Аўтарка ліста ў "К" Інэса Ігнацьеўна дык ўвогуле пражывае менавіта ў гэтым доме… Не стамляецца згадваць пра тое, што было ў бібліятэца імя Маўра шматлюдна: дзеці прыходзілі з мамамі і бабулямі. А ўнук спадарыні Раткевіч Коля запісаўся ў чытачы аж з пяці гадоў. Цяпер яму 15 і ён — актыўны чытач ужо дарослай бібліятэкі…

Хто ж выйграў? Відаць, той, хто займее, скажам, памяшканне ў цэнтры Мінска. Хацелася, каб адкрыўся тут музейчык, галерэя ці іншая бібліятэка. Але ж матэрыяльнае з духоўным паспяхова судакранаюцца рэдка. Рынкавыя законы замінаюць. А будынак на Казлова, 12 — уласнасць Мінгарвыканкама. Пабачым, што там размесціцца неўзабаве. ..

Шкада, што імя Маўра дзіцячай бібліятэкай згублена. Гэта ж унікальны чалавек! Не толькі пачынальнік нашай прыгодніцкай ды фантастычнай літаратуры, але і эсперантыст, бібліяфіл з энцыклапедычнымі ведамі, а яшчэ — знаўца спірытызму, скрыпач, вандроўнік-веласіпедыст. Вялікі арыгінал, бо любіў пісаць за імправізаваным сталом, які навісаў над Свіслаччу, а пісьменнік, звесіўшы ногі ў ваду, уяўляў, што гэта акіян. На прыкладзе Маўра толькі і выхоўваць у дзецях высакародства памкненняў. Як сцвярджае Інэса Раткевіч, шыльда з надпісам "…імя Янкі Маўра" вісела на доме да апошняга.

Я звярнуўся да начальніка Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама Руслана Трухана з пытаннем: "Няўжо бібліятэчнае найменне знікла беззваротна?" Вось што ён паведаміў: "Кніжныя фонды перавезены на Гікала. А дзіцячая бібліятэка — філіял Бібліятэкі імя Пушкіна, іншымі словамі — структурнае падраздзяленне юрыдычнай асобы. Так што апошнія гады асобнай установы імя Янкі Маўра проста не існавала"… Вось такая казуістыка з установай, што не з'яўлялася юрыдычнай асобай, але гадамі была асветлена асобай Янкі Маўра. Патлумачыць сітуацыю — усё адно што разабрацца, пераважала ў чалавеку ягонае цывільнае найменне "Іван Міхайлавіч Фёдараў" ці ўсё ж рэй вяла асоба пад псеўданімам "Янка Маўр"?.. Атрымліваецца, што наяўнасць "імянной" шыльды апраўдвалася наяўнасцю асобнага бібліятэчнага будынка. Ды традыцыяй: ну не змянялі шыльду — і ўсё тут..

Як толькі будынка не стала, пакінуць аддзелу імя Янкі Маўра ў бібліятэцы імя Пушкіна ўжо і не выпадала. Не сумяшчаюцца два ў адным. Так, дырэктар Мінскай абласной Аксана Кніжнікава кажа, што сёння ў дзіцячым аддзеле — таксама шматлюдна. Аднак у ідэале асабіста для мяне (і, як ведаю, для многіх профі) у сталіцы павінна існаваць яшчэ адна біблятэка з такім жа трывалым юрыдычным і грамадска-сацыяльным статусам Нацыянальнай, што і ў "дарослай". І гэтая біліятэка мае стаць дзіцячай. Урэшце, няблага, каб атрымала яна імя Янкі Маўра — чалавека, які бачыў у свіслацкай хвалі дзявятую хвалю ўсіх акіянаў свету, які трымаў за руку ўсю дзятву Беларусі і дарыў ёй шчасце першаадкрыцця: свету і сябе. Бо гэта вельмі важна, з якім думкамі і памкненнямі прыйдзе ў жыццё маленькі чалавек. Ці здолее ён стаць грамадзянінам? Ці адчуе гонар за краіну? Ці здолее гэты гонар прымножыць?

Так што Нацыянальная дзіцячая мае стаць унікальнай. Тут явай акажацца фантамабіль. І можна паўтарыць палескую рабінзаніяду. І Тубі не будзе плакаць. І ніхто не захварэе на амок…

Усё правільна напісала ў лісце Інэса Раткевіч. Адразу пасля Вялікай Айчыннай узяліся аднаўляць краіну з таго, што адкрылі бібліятэчны факультэт (яму — 70 гадоў) і адрамантавалі бібліятэкі. Той, хто чытае, умее думаць. Той, хто ўмее думаць, імкнецца не рабіць чужых памылак.

Карацей, Маўру нельга сыходзіць, у яго яшчэ шмат спраў.

К

> Вось такая казуістыка з установай, што не мела юрыдычнай асобы, **але гадамі была асветлена асобай Янкі Маўра.** Патлумачыць сітуацыю — усё адно што разабрацца, пераважала ў чалавеку ягонае цывільнае найменне "Іван Міхайлавіч Фёдараў" ці ўсё ж рэй вяла асоба пад псеўданімам "Янка Маўр"?..

Ад рэдакцыі

Гэта сёння — дзеці…

І яшчэ нюанс у працяг тэмы. Некалькі тыдняў таму ў Мінску ўрачыста адкрылася бібліятэка імя Сяргея Міхалкова ў гімназіі № 1 імя Францыска Скарыны.

Адбылося гэта ў рамках акцыі "Сёння — дзеці, заўтра — народ" Расійскага фонда навукі і культуры пра падтрымцы Расійскага ж цэнтра навукі і культуры ў беларускай сталіцы. Такім чынам, зазначылі арганізатары акцыі, Беларусь далучылася да прасторы Польшчы, Славакіі ды Ірландыі, дзе таксама створаны бібліятэкі імя Сяргея Міхалкова. А пры падтрымцы Рассупрацоўніцтва і Расійскага фонда культуры новай установе будзе аказана падтрымка ў камплектаванні фонда выданнямі твораў рускай і сусветнай літаратуры. Так адзначалі прамоўцы пад час імпрэзы, згодна з паведамленнямі медыя.

Прыкладна ў той самы час Інэса Ігнацьеўна Раткевіч заўважыла, што звыклая яе воку шыльда з найменнем Дзіцячай бібліятэкі імя Янкі Маўра знікла са сцяны дома па мінскай вуліцы Казлова...

І пасля шматкроп'я — яшчэ раз фраза з ліста нашай чытачкі: "Пасля Вялікай Айчыннай вайны, калі горад быў разбураны, аднаўленне пачалося з клопату аб дзецях". І дададзім сюды назву акцыі, у рамках якой адкрыта бібліятэка імя Сяргея Міхалкова:"Сёння — дзеці, заўтра — народ". Усё так, пагадзіцеся. Пасыл — правільны. Хіба не зусім зразумела, чаму такія ж бібліятэкі (скажам, імя Маўра, Купалы ці Коласа) не адкрываюцца сістэмна беларускімі інстытуцыямі за мяжой у фармаце аналагічных маштабных акцый. І не аказваецца, разам з тым, дапамога ў камплектаванні фонда выданнямі твораў беларускай літаратуры. І зусім незразумела, чаму пасыл "Сёння — дзеці, заўтра — народ" так і не прагучаў з вуснаў айчынных менеджараў культурнай сферы ў дачыненні да беларускіх дзіцячых бібліятэк. Адпаведна, і да будучага свайго народа — дзяцей. Пакуль яго мы пачулі толькі ад суседзяў.

Так што Маўру сапраўды нельга сыходзіць, у яго насамрэч шмат спраў. Бо і сапраўды так важна, з якім думкамі і памкненнямі прыйдзе ў вялікае жыццё маленькі чалавек, ці здолее ён стаць грамадзянінам, ці адчуе гонар за сваю краіну? І ці здолее гэты гонар прымножыць?

К

ф о т а ф а к т

"Трыбунал" у Новым

17 — 18 сакавіка ў сталічным Новым драматычным тэатры адбылася прэм'ера спектакля "Трыбунал" па аднайменнай п'есе Андрэя Макаёнка. Нагодай для пастаноўкі Сяргея Кулікоўскага стала 70-годдзе Вялікай Перамогі. Рэцэнзію на новую рэдакцыю знакамітай айчыннай трагікамедыі чытайце ў адным з бліжэйшых нумароў "К".

Фота Аліны САЎЧАНКА

Першы Адкрыты рэгіянальны фэст батлеечных калектываў **"Чароўны свет батлейкі"** распачнецца сёння ў Смаргоні.

"Жывы" фармат галерэі

ТЭКСТ

Крысціна ЛЯДСКАЯ,
арт-куратар, старшы навуковы супрацоўнік Гарадской мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва

У Гарадской мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва вопыт супольнага малявання — не рэдкасць. Адзін з апошніх на сёння досведаў — "Развіртуалізацыя № 2 з газетай "Культура", чарговы выхад рэдакцыі да чытачоў ды падпісчыкаў і, гэтым разам, да наведвальнікаў нашай галерэі — непасрэдных спажыўцоў культурнага прадукту. На пляцоўцы працавала мастак, педагог Ганна Гадзірава.

У галерэі стала традыцыяй запрашаць маляваць на зададзеную тэму ў "Ноч музеяў" з арганізацыяй вернісажу работ удзельнікаў і конкурсу глядацкіх сімпатый (фармат карыстаецца папулярнасцю). Акрамя таго, ладзяцца адкрытыя аўтарскія майстар-класы на фоне бягучых экспазіцый, а да нядаўняга часу праводзіліся і спецыялізаваныя майстар-класы па маляванні для дзяцей з дзіцячым цэрэбральным паралюшам. Асноўная мэта такіх імпрэз — не навучанне прафесійным навыкам малявання, бо курсаў па названым профілі хапае з лішкам. Галоўная ж ідэя — інтэграцыя наведвальнікаў у музей як у жывую прастору праз сумесныя творчасць, пераадоленне эмацыйнай адасобленасці на карысць актыўнага ўспрымання мастацтва і прадуктыўнай камунікацыі ў музейным асяроддзі.

■ І мы тут не вынаходзім ровар. Праўда, беларуская публіка **ўсё ж валодае некаторай спецыфікай**: людзі ў нас больш адчуваюць дыстанцыю, больш абцяжараныя ўмоўнасцямі, з большай інтэнсіўнасцю адчуваюць страх публічнасці і баяцца негатыўнай ацэнкі, таму інтэгруюцца не адразу.

Разам з іншымі формамі інтэрактыўнасці, гэта яшчэ адзін спосаб зрабіць музей больш прывабным для публікі. Цікава ж прыйсці ў галерэю памаляваць разам з мастакамі сярод работ прафесіяналаў, увабраўшы інфармацыю праз вопыт, а не проста прабегчыся па залах "для птушачкі". Мяркуючы па папулярнасці мерапрыемстваў, людзям цікава адчуць сябе ў сценах галерэі саўдзельнікам, творцам.

І мы тут не вынаходзім ровар — такая практыка даўно прыжылася ў музейных установах па ўсім свеце, паступова яна развіваецца і ў нас. Праўда, беларуская публіка ўсё ж валодае некаторай спецыфікай: людзі ў нас больш адчуваюць дыстанцыю, больш абцяжараныя ўмоўнасцямі, з большай інтэнсіўнасцю адчуваюць страх публічнасці і баяцца негатыўнай ацэнкі, таму інтэгруюцца не адразу. Але дэвіз "маляваць могуць усе" дапамагае зняць лішнія комплексы і дазваляе чалавеку раскрыцца, узяць у рукі пэндзаль або аловак ды распавесці сваю гісторыю.

Амаль кожны госць майстар-класа пачынае з нясмелага: "Я не ўмею маляваць, таму проста пагляджу". Далей ідзе мяккая праца галерыстаў ды мастакоў-педагогаў па ўключэнні ў творчы працэс (ніхто не павінен сысці, не выпрабаваўшы сябе), па зняцці бар'ераў, выбудоўванні матывіроўкі, вызначэння тэмы, любой іншы тэхнічнай, інфармацыйнай і маральнай дапамогі. Нарэшце надыходзіць момант, калі чалавек занурваецца ў працэс і аддаецца творчасці.

Для арганізатараў, якія знаходзяцца ў гэтым дзействе па іншы бок мальберта, хоць і, часцей за ўсё, з пэндзлем у руцэ, вопыт аказваецца цікавым і павучальным. Спашлюся тут на словы Наталлі Жыгамонт, адной з мастачак, якая прымала ўдзел у "Ночы музеяў-2014" у якасці педагога: "Творчасць заўсёды прыносіць чалавеку радасць, і яна заключаецца не толькі ў стварэнні ўласнага твора, але і ў магчымасці ўцягнуць у працэс іншых людзей. Пляцоўка галерэі — унікальнае месца, дзе па-свойму можа рэалізоўвацца творчы патэнцыял наведвальнікаў, але ў роўнай ступені і талент педагога-мастака. Гэта складаны і ўзаемаўзбагачальны працэс. Галоўнае, што чалавеку ўласціва ператварацца, калі ў яго руцэ апынаецца пэндзаль ці аловак, а перад ім — аркуш паперы. Імпульсам жа могуць стаць словы мастака або куратара. І аднойчы прайшоўшы дарогай творчай імправізацыі, чалавеку абавязкова захочацца вярнуцца і зноў адчуць той прыліў сіл і натхнення, які ён тут зведаў…"

Правядзенне падобных імпрэз у "жывым" фармаце ў галерэі дэманструе: усе людзі, незалежна ад іх прафесійных заняткаў, жыццёвых прыхільнасцей і ўзросту, з задавальненнем і цікавасцю перажываюць вопыт прысутнасці ў ажылай прасторы галерэі, якая на час стала для іх прасторай уласнай творчасці. Вынік — і створаны маленькі шэдэўр, і змена эмацыйнага стану аўтара, і задавальненне ад зробленага творчага дзейства, і змена стаўлення да прасторы музея або нават да мастацтва наогул.

Мы шукалі каларыт…

меркаванне

Алег ХАМЕНКА,
старшы выкладчык Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, фалькларыст, музыкант

Некалькі гадоў таму ў "Палаца" ўзнікла нечаканая ідэя. Мы знаёмыя з многімі мінскімі тэатральнымі дзеячамі. А менавіта Рэспубліканскаму тэатру беларускай драматургіі гурт прапанаваў не проста ўвесці некалькі нашых нумароў у рок-оперу "Адвечная песня" паводле паэмы Янкі Купалы, а яшчэ і заняць удзельнікаў гурта ў пастаноўцы ў ролях… музыкантаў.

Праз час мы вярнуліся да гэтай размовы, паколькі пытанне абнаўлення музычнай часткі спектакля паўстала вельмі востра: ранейшая аранжыроўка, безумоўна, састарэла. (Ад ідэі з музыкантамі-артыстамі ўсё ж адмовіліся.) Патрабавалася ці ўвогуле яе пераасэнсаваць, ці паўтарыць, выкарыстоўваючы сучасны саўнд, іншыя, больш выразныя для сённяшняга часу інструменты. У арыгінальнай версіі ёсць нумары як вельмі добрыя, так і сыграныя нібыта на якіхсьці самаробках, карацей, — гучалі ўжо несалідна. Ну і пасля перамоў было вырашана, што мы ўсе трэкі (іх два тузіны) перааранжыруем і перазапішам. Але саму музыку, мелодыі Цімура Каліноўскага, чапаць не станем, за выключэннем двух нумароў — яны сапраўды змяніліся да непазнавальнасці.

Ёсць такое паняцце, як "сучасная нацыянальная музыка". Сучасная — зразумела чаму, нацыянальная — бо рытміка, мелодыка, тэмбральнасць, гарманізацыя ўласцівыя музыцы менавіта гэтай нацыі. Я ўжо не кажу пра мову, якая і задае рытм, вызначае напеўнасць. Беларускае музычнае мысленне — гэта не выдумка. Напрыклад, яно прасочваецца ў Яўгена Глебава ў тым жа балеце "Маленькі прынц" або ў ягонага ж аўтарства саўндтрэку да фільма "Дзікае паляванне караля Стаха". Там жыве каларыт і Усходняй Еўропы наогул, і Беларусі ў прыватнасці. Калі карыстацца зусім прафесійнымі тэрмінамі, у беларускім фольку ёсць асаблівыя "даленне" і "трыяленне", такты, па якіх спецыяліст вызначыць прыналежнасць музыкі. Ну, калі не канкрэтна да нашай краіны, дык да той еўрапейскай тэрыторыі, з размешчанымі на ёй дзяржавамі, у якую ўваходзім і мы.

■ Патрабавалася **ці ўвогуле музычную частку спектакля пераасэнсаваць, ці паўтарыць,** выкарыстоўваючы сучасны саўнд, іншыя, больш выразныя для сённяшняга часу інструменты.

Беларуская мелодыка больш сціплая, у адрозненне ад, скажам, украінскай, але з пункту гледжання гармоніі яна куды цікавейшая. Большасць айчынных народных песень пачынаецца з дамінанты, а не з тонікі. Такога няма ні ў украінцаў, ні ў расіян, ні ў немцаў — можа, латышы і літоўцы ў гэтым сэнсе нам бліжэйшыя. Плюс тэмбральнасць, якую даюць інструменты, манера дыхаць, спяваць. І ўсё гэта забяспечвае нацыянальны музычны каларыт. Думаю, наша аранжыроўка такі каларыт у "Адвечную песню" прыўнесла. Аднак, калі не браць у разлік вакал, я б каларыт той назваў ўсходне-еўрапейскім, але, паўтаруся, мы ад яго неаддзельныя.

Аранжыроўка, якую мы прапанавалі ў "…Песню", — гэта менавіта пошук нацыянальнага музычнага каларыту, характэрнага толькі для нашага народа і яго традыцыйнага музычнага мастацтва. Падобны каларыт у творчасці "Палацу", можа, не гэтак відавочна, але прысутнічае. Прынамсі, не ведай я беларускай мовы, падумаў бы, што гэта спяваюць славакі, палякі або, дапусцім, літоўцы. Нават быў сведкам таго, як людзі, што слухалі "Палац", ідэнтыфікавалі яго музыку як… украінскую. Смешна, вядома, але затое тыя слухачы адчулі, што ў ёй ёсць нешта нацыянальнае. У нашай фарматнай поп-музыцы я не толькі беларускага не чую, але і сучаснага. За вельмі рэдкімі выключэннямі, прыклады якіх з ходу і не згадаю. Нават у мулявінскіх "Песняроў" музыка была… савецкая эстрадная, затым постсавецкая. Прытым, што спявалася яна і на беларускай мове, і тэксты былі фальклорныя, і за аснову браліся нейкія народныя напевы і мелодыі. Прынамсі, так мне бачыцца сёння.

Спадзяюся, аранжыроўкі надалі свежае дыханне кампазіцыям, спектаклю наогул, што артысты з задавальненнем заспявалі па-новаму. І мне спачатку хацелася, каб гурт не асацыявалі з гэтай трактоўкай музыкі да пастаноўкі, каб атрымалася нешта непадобнае на нас. Мы спрабавалі сыграць, як не-"Палац". Але… стала "ламаць", атрымлівалася зусім ужо не наша, чужое, няблізкае творча. Я б не сказаў, што вынік атрымліваўся дрэнны, але гэта быў не той вынік, які мы самі ад сябе чакалі. І тады ўнеслі ў аранжыроўкі крыху больш… папсовасці, ці што. І ўсё ўстала на свае месцы. Мы граем папулярную музыку, спектакль, разлічаны на звычайнага гледача. Тым не менш, атрымалася нешта… асаблівае. Хочацца верыць, што "Палац" не сапсаваў ледзь не лепшую, на мой погляд, пастаноўку гэтага тэатра.

Занатаваў Алег КЛІМАЎ

Праца тварам і каляровыя калготы

ТЭКСТ

Ганна КІСЛІЦЫНА,
літаратурны крытык, супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Ужо пару месяцаў цягну з двума інтэрв'ю… Не, я вельмі люблю жанр інтэрв'ю, асабліва — відэаінтэрв'ю. Мне заўжды ёсць што сказаць, і я выдатна выглядаю на экране. Хто не верыць — пераглядзіце перадачы з маім удзелам.

Было б неразумна какетнічаць і казаць пра тое, што я не фотагенічная. Але — ненавіджу гэты момант, калі ты сядзіш у паўцёмным памяшканні, непрыстасаваным для здымачнага працэсу, думаеш над тым, што скажаш, ці над чужымі словамі альбо спрабуеш на сцэне рассмяшыць слухача… Адкрываеш рот… І тут — шчоўк-шчоўк: цябе проста з адкрытым ротам здымае фатограф, які фотаапарат не так даўно ў рукі ўзяў, ды і не мае паняцця пра значэнне святла і кампазіцыі…

Калі цябе здымаюць пад час выступу — яшчэ туды-сюды, хоць задавальненне так сабе, калі фатограф, скажам, здымае знізу, кладучыся літаральна пад ногі… Але ж цябе здымаюць усе дзве гадзіны, пакуль ідзе прэзентацыя — злева, справа, збоку… І дзе ж ты расслабішся, засмяешся на свае трыццаць два ці насупіш бровы? А культурны фатограф гатовы ўнесці твае трыццаць два ў вечнасць, каб ты перыядычна знаходзіў свае фота ў Сеціве і ўздрыгваў!

■ Вы заўважалі, што тэкстаў, якія апісваюць прэзентацыі, цяпер падаюць вельма мала — усё сыходзіць у фота? **Рабіць аналіз таго, што адбываецца, няма часу — трэба апрацоўваць здымкі…**

Вы заўважалі, што тэкстаў, якія апісваюць прэзентацыі, цяпер падаюць вельма мала — усё сыходзіць у фота? У мяне нават складваецца такое ўражанне, што цяпер праца журналіста проста немагчымая без працы фатографа. І рабіць аналіз таго, што адбываецца, няма часу — трэба апрацоўваць здымкі… А кнігі на прэзентацыях — гэта наогул лішак, учарашні дзень. Галоўнае — стыльная публіка ў зале: яркія шалікі, каляровыя калготы, квадратныя акуляры маюць для цяперашняга літпрацэсу значэнне калі не большае, то і не меншае, чым самі кнігі. Насамрэч, у мяне горы эпатажнай вопраткі. Але пасля наведвання вечарын, лаўлю сябе на тым, што замовіла ўжо трэцюю шэрую сукеначку, шэранькі шалік і шэранькі бярэт… Трэба ж неяк вылучацца.

Дарэчы, я рэальна разумею, чаму на прэзентацыях адна моладзь: бо цяпер прыход на прэзентацыю, гэта не "расслабон", а праца тварам. Праўда, нядаўна заўважыла, што ў нас ёсць некалькі пісьменнікаў, якія нават на агульных здымках залы заўсёды глядзяць на фатографа… То бок усе на сцэну, а яны — у аб'ектыў.

І ў сувязі з усім гэтым мне страшна старэць… Бо цяпер чалавек, які займаецца літаратурай, павінен увесь час свяціць "таблом". Калі піша калонку, рэцэнзію, калі дае інтэрв'ю ці ўдзельнічае ў "круглым стале", у чужой прэзентацыі… Але ў мяне няма запаснога прэзентацыйнага твару, і я не хачу да старасці гадоў выглядаць фрыкам у яркіх калготках! Я хачу літаратуру з літарамі, а не з фотаздымкамі. Да ўсяго, ненавіджу свае фота з адкрытым ротам, хаця, паколькі я звычайна выходжу на публіку, каб нешта сказаць або прачытаць, то гэта амаль непазбежна. Суцяшае толькі тое, што ёсць фатографы, якія ведаюць пра адкрыты рот, і я ведаю гэтых фатографаў, і ўсе іх ведаюць. Праўда, у выніку на рынку перамогуць яны. Бо блукаць па рэдакцыях ды скандаліць, каб здымалі фота, якія мне не падабаюцца — гэта дыскрэдытаваць справу, якую робіш. Тым не менш, за апошнія паўгода я адмовілася ад такой колькасці здымкаў, што раней проста і не ўяўляла, што такое можа быць у прынцыпе. Бо цяпер нямала асяродкаў, якія займаюцца культурай. Урэшце, нядаўна мне параілі: "Дык вадзі прафесійнага фатографа з сабой!.."

Я не баюся старэць і мяняцца. У выніку людзі ўсё адно будуць меркаваць па справах. А на помніку ёсць месца толькі для аднаго фота. Хаця людзі наогул не глядзяць на справы… Пасля таго, як магілу Уладзіміра Конана заліло вадой, а яго рукапісы аддалі ЖЭС, я перастала верыць у значэнне спраў чалавека.

А мерапрыемстваў культурных больш, чым "культурных журналістаў", — гэта факт. Мне ж здаецца, што цяпер культурнай журналістыкай займаюцца ўсе, хто па нейкай прычыне не захацеў працаваць на заводзе. Тое ж і з фатографамі.

Цэнтральнай падзеяй Дзён беларускай культуры ў Францыі стануць гастролі Вялікага тэатра Беларусі, што распачынаюцца **сёння ў Ліёне**.

Узроўні Пінігіна

Мастацтва магчымага і немагчымага, або Дзе ўзяць неметафарычную "дубіну" для свядомасці?

Учора, сёння і заўтра ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы — прэм'ера чэхаўскай "Чайкі". А напярэдадні адбылася сустрэча рэдакцыі "К" з рэжысёрам гэтага спектакля — мастацкім кіраўніком тэатра Мікалаем ПІНІГІНЫМ. Пачалася размова, вядома, з новай пастаноўкі, каб потым рушыць у самыя розныя бакі, што тычацца не толькі мастацтва, але і жыцця.

Падрыхтавала
Надзея БУНЦЭВІЧ



Фота Аліны САЎЧАНКА

— Ваша "Чайка" — далёка не першы за апошні час зварот да гэтай п'есы ў нашых тэатрах. На сталічнай афішы, падобна на тое, будуць суіснаваць адразу тры розныя пастаноўкі: нядаўняя прэм'ера ў Маладзёжным тэатры, ваша цяперашняя — у Купалаўскім і аднаўленне ранейшага спектакля ў лялечным.

— Так, Чэхава ставяць паўсюль, і не толькі ў Беларусі. Бо ў ягоных п'есах няма "прывязкі" ні да палітыкі, ні да эканомікі, ні да грамадства ў шырокім сэнсе слова — у цэнтры ўвагі толькі людзі і іх узаемаадносіны, якія цікавыя заўсёды і ў якіх кожны пазнае сябе. Чаму менавіта "Чайка"? Самае галоўнае пытанне ў ёй — пра што ж напісаў сваю п'есу Трэплеў. Гэта своеасаблівы тэст для рэжысёра. А напісаў ён яе пра тое, што калісьці адбудзецца які-небудзь глабальны катаклізм, зямля знікне, застанецца толькі пустэча, як на іншых планетах Сонечнай сістэмы. І шмат тысячагоддзяў нічога не будзе — да новага стварэння жыцця. Гэта ўсё тое, што сёння паказваюць штодзень па навукова-папулярных тэлеканалах. А тады, калі пісалася "Чайка", пра гэта ніхто і не задумваўся. Чэхаў апярэдзіў свой час, аказаўся прарокам, бо прадбачыў магчымыя будучыя падзеі. Гэта — апакаліптычная свядомасць. Мы ж па-ранейшаму робім выгляд, быццам нічога не адбываецца, быццам мы і ўся Зямля — вечныя. Вось пра што гэта п'еса!

Чэхаў не толькі ў "Чайцы", але і ў іншых сваіх п'есах звяртаў увагу на тое, што чалавек ставіцца да сваёй планеты як варвар: знішчае лясы, рубіць вішнёвыя сады. Калі так разабрацца, дык у "Чайцы" ўсяго адзін станоўчы персанаж — цудоўнае возера. І п'еса па жанры азначана аўтарам як камедыя. У Чэхава ўсе п'есы — камедыі. Бо ён так ставіцца да людзей.

Я ўжо гадоў 10 — 15 пра гэта думаю! У мяне даўно такое адчуванне, што мы на парозе сур'ёзных змен у чалавечай свядомасці. Таму сёння ніхто не разумее, пра што ставіць, пра што размаўляць з гледачом. Яшчэ зусім нядаўна ўсё было зразумела: дастаткова сказаць, што камуністы дрэнныя, а дэмакраты добрыя, што Савецкі Саюз — турма, і ўсё — спектакль адбыўся. А пра што гаварыць з гледачом сёння, калі ўсе ўсё ведаюць і калі так рэзка змяняецца чалавечая свядомасць? Адбываецца гэта таму, што змянілася сама інфармацыйная прастора. Такіх змен не было на працягу жыцця ўсяго чалавецтва!

— Шмат чаго змяняецца і ўласна ўнутры тэатральнай прасторы, у тэатры як культурнай установе, у існаванні тэатральных калектываў.

— Савецкі тэатр пазіцыянаваўся як дом, сям'я. І ганарыўся гэтым. А ці можаце вы ўявіць сабе падобныя адносіны на Захадзе? Каб малады рэжысёр, да прыкладу, як у фільме Канстанціна Худзякова "Поспех", угаворваў старую прымадону, літаральна стаяў бы перад ёй на каленях, каб толькі яна пагадзілася штосьці выканаць? Бо яна — заслужаная і народная. А хто такі ён? На Захадзе ўсё іначай. Ёсць праца. І калі ты ўзяўся працаваць, дык працуй! А ў нас былі збітыя арыенціры, адказнасць за сваю працу падмянялася калектыўнай безадказнасцю. Але колькі ні змянялася б тэатральнае закуліссе, застаецца і будзе заставацца правіла: рэжысёр павінен захапіць артыста ідэяй. Іначай нічога не адбудзецца! Гвалтам артыстаў не возьмеш, нават калі яны пагодзяцца зрабіць усё як след.

— Значыць, формула: "тэатр — гэта сям'я" не для вас?

— Савецкі тэатр-сям'я — знікае. Бо што такое сям'я? Вы можаце, да прыкладу, сказаць сваёй жонцы, што яна непрыгожая, можаце штосьці патрабаваць ад яе? Неяк літоўскі рэжысёр Рымас Тумінас выказаў думку, пра якую я даўно думаю: тэатр — гэта ансамбль. Вы прыйшлі на працу — і вы ансамбль. А іначай… Вы не можаце нічога выказаць, баяцеся пакрыўдзіць, бо вы сям'я. Не можаце адправіць чалавека на пенсію, бо ён шмат адпрацаваў, мае званні. Не можаце патрабаваць ад яго аддачы, бо ўнікаеце ў яго складанае становішча. А галоўным павінен быць вынік. Бо менавіта гэта хвалюе гледача, калі ён прыходзіць у тэатр, а не якіясьці ўнутраныя абставіны, тое, якім чынам гэта было дасягнута.

— Як вы ставіцеся да мадэлі тэатра, дзе непрафесіяналы (груба кажучы, людзі "з вуліцы") удзельнічаюць у пастаноўках нароўні з прафесійнымі артыстамі? Такія тэндэнцыі апошнім часам сталі распаўсюджанымі, нават "модным". Дый у самім тэатры нам імкнуцца паказаць "жыццё, як яно ёсць".

— Трэба бачыць розніцу між вуліцай і мастацтвам. Тэатр, як і ўсялякае мастацтва, мае сваю мову. А калі з тэатральных падмосткаў "бл… бл… бл…" — дык гэта пра што? Тэатр — гэта ўвогуле не жыццё, а іншае вымярэнне, рэчаіснасць, якая жыве па сваіх законах жыцця.

— Вы працавалі і ў рэпертуарных тэатрах, і ў антрэпрызных. Дзе было ставіць прасцей? Якая ўвогуле з гэтых мадэляў вам бліжэйшая? Хаця, пэўна, цалкам ідэальнай няма і быць не можа…

— У кожнага з гэтых варыянтаў існуюць свае праблемы. У антрэпрызы — свае задачы. Там ёсць прадзюсар, які ўкладае свае грошы і думае пра тое, як яму зарабіць ці хаця б у "мінусе" не апынуцца. Адпаведна, патрабуюцца больш "дэмакратычныя" п'есы, на якія пайшоў бы глядач. У дзяржаўным тэатры — з аднаго боку, ёсць інтарэсы дзяржавы, з іншага — тэатр таксама вымушаны ўвесь час думаць, дзе і як яму зарабіць, бо фінансуецца ўсяго адна пастаноўка на год. Колькі там чалавек можна заняць? А ўсяго ў трупе — 64 артысты. Вось і атрымліваецца гэты дысбаланс. Ці ж так павінна быць? У Францыі, да прыкладу, чатыры з паловай тысячы тэатраў. Але дзяржаўных — адзінкі. Становішча артыстаў — як у кінаіндустрыі: іх запрашаюць на тыя ці іншыя ролі, не больш за тое. А Сталін зрабіў 563 дзяржаўныя тэатры па ўсёй Краіне Саветаў, разумеючы іх як ідэалагічную машыну. Ніхто ў свеце ніколі не мог сабе дазволіць утрымліваць такую колькасць тэатраў!

— Наколькі наша мадэль тэатра, дзе існуе пастаянная трупа, перспектыўная? Ці трэба яе ламаць?

— Я не тэатральны прадзюсар і не менеджар. Гэтым павінны займацца іншыя людзі — зразумела, творчыя, але разам з эканамістамі, каб прыдумаць для новага тэатра эканамічную мадэль. Пакуль жа атрымліваецца, што рэжысёр павінен забяспечыць ролямі ўсіх артыстаў. Карацей, даваць "працу", "загрузіць" трупу. І кожны выкручваецца, хто як можа. На кожную ролю — падвойны склад, бо артысты ўдзельнічаюць у здымках, яшчэ дзесьці падзарабляюць. І за шчасце трэба лічыць, калі прыходзяць на рэпетыцыю. Атрымліваецца не столькі тэатр, колькі драмгурток пры кіна- ці рэкламнай студыі — там, дзе лепш плацяць. Але так не павінна быць! Патрабаваць штосьці можна толькі тады, калі ты маеш эканамічныя рычагі. Дык што тады патрабаваць ад маленькіх рэгіянальных тэатраў? Жывуць, як могуць. А ў тэатры, паўтару, галоўным павінен быць мастацкі вынік.

— Ці ёсць у вас свая сістэма ацэнкі ўласных жа вынікаў?

— Няма. Спектакль — як дзіця. Вы нарадзілі яго і думаеце, што ён стане пісьменнікам, касманаўтам, навукоўцам, лаўрэатам Нобелеўскай прэміі. А ён паліць, п'е, не працуе…

— Якіх спектакляў патрабуе тэатр са статусам "нацыянальны"?

— У нашых абставінах нацыянальны тэатр — ёсць. А нацыі пакуль што няма. Гэтым мы і спрабуем займацца, працаваць са свядомасцю гледача. Жыхары таго ж Панявежыса, ведаю, разоў па пяць — сем хадзілі на адзін і той жа спектакль, толькі каб падтрымаць свой нацыянальны тэатр. Гэта зусім іншы ўзровень нацыянальнай свядомасці!

— Нацыянальны тэатр — гэта пэўныя спектаклі, адпаведны ўзровень трупы, штосьці іншае?

— Усё разам. Як, да прыкладу, у літоўцаў. Там Някрошус амаль не ставіў літоўскіх аўтараў — ішоў Чэхаў, Гётэ, Шэкспір. Бо не было нацыянальнай драматургіі такога ж узроўню. І ніхто ад гэтага не пакутаваў. Ніхто не казаў, чаму ты не ставіш таго ж Макаёнка, Крапіву.

— Суадносіны нацыянальнай культуры і сусветнай — рэч заўсёды складаная. У "Дзікім паляванні караля Стаха" Уладзімір Караткевіч нічога асаблівага не выдумляў, проста пераклаў "Сабаку Баскервіляў" на беларускія рэаліі. Але ці трэба гэта рабіць — шукаць свайго нацыянальнага героя на месца Рычарда III? Ці нельга звярнуцца да класікі, але ўвасобіць яе на свой манер?

— Што да апошняга, дык так звычайна і бывае. У пачатку 1980-х я працаваў у Тэатры імя Горкага, і з "Макбэтам" у пастаноўцы Барыса Луцэнкі мы паехалі ў Германію. Там паглядзелі наш спектакль і кажуць: "Які цуд! Нарэшце мы бачым славянскага Шэкспіра!" А ніхто не рабіў гэтага наўмысна, ніхто не імкнуўся абавязкова зрабіць Шэкспіра "заўзятым беларусам". Проста ўсе мы тыя, хто мы ёсць. Нам можа здавацца, што мы ставім Шэкспіра, а насамрэч мы ўвасабляем сябе саміх. Што ж да "… Стаха", дык зрабіць такі "пераклад" на нашы рэаліі — зусім няпроста. Ён ніколі не напісаў бы ні гэтага, ні іншых падобных твораў, калі б не быў гісторыкам і не цікавіўся б так шчыра беларускай мінуўшчынай. Існуюць так званыя вечныя сюжэты і вечныя вобразы. Наконт іх колькасці вядуцца спрэчкі: хтосьці налічвае каля сарака, хтосьці ўсяго чатыры — пяць. Але справа не ў колькасці, а ў тым, што яны сапраўды існуюць. І што ўсё астатняе — толькі варыяцыі на іх, але ж якія разнастайныя! Бо гэтыя сюжэты — толькі схема. А спектакль, як і ўсялякі мастацкі твор, — гэта найперш дух. І гістарычныя абставіны, розныя для розных народаў.

— Як вы ставіцеся да сучасных перайначванняў класікі, да тых жа пераносаў дзеяння ў сучаснасць? Гэта сведчанне таго, што бракуе сучаснай драматургіі? Ці штосьці іншае?

— Сучаснай драматургіі заўсёды бракуе, а сёння тым больш. Гэта самы складаны літаратурны жанр. Але гэта яшчэ і сусветны працэс. Я заўважаю, што сучаснай драматургіі сёння недастаткова ні ў Польшчы, ні ў Германіі ці Францыі. Зніклі добрыя камедыі, літаратура пра чалавека. Ёсць хіба танная белетрыстыка ці, у лепшым выпадку, публіцыстыка. Але гэта іншыя жанры! Раней у мяне вялізны стос п'ес ляжаў, замежных, а сёння ніводнай. Да класікі ж звяртаюцца таму, што там адлюстраваны праблемы, актуальныя і па сёння. У той жа Італіі паставілі "Рэвізора". Чаму? А яны кажуць: "У нас жа мафія! Мафія і хабар". Кажуць, маладыя беларускія драматургі сёння больш запатрабаваны ў Расіі. І гэта выдатна! Хай працуюць на расійскім рынку. Але я не бачу сур'ёзнай беларускамоўнай драматургіі, якую трэба было б ставіць сёння.

Ёсць публіцыстыка, дзе гаворыцца "пра праблемы". А ёсць літаратура пра чалавека, дзе ўсё зразумела з ягоных слоў, учынкаў, характару. Што такое "п'еса на сучасную тэму"? Часцей гэта публіцыстыка, а не драматургія. І як стварыць апошнюю, я не ведаю. Гэта складаная тэма! У прынцыпе, паставіць можна ўсё. Нават тэлефонную кніжку. Толькі навошта?

— Вам як рэжысёру даводзілася ісці на кампрамісы?

— Канешне. Само жыццё — гэта ўжо кампраміс. Вось я зараз з вамі размаўляю — і раблю балюча паветру, бо калі вымаўляю словы, дык "націскаю" на яго. Ці ж гэта не кампраміс? І так паўсюль і заўжды! Для кожнага чалавека гэта асабістае пытанне, усё вельмі індывідуальна. І кожны сам вырашае, як яму рабіць: ісці на кампраміс ці не. І ў кожнага, пэўна, будзе свая праўда. Дыпламатыя — гэта мастацтва магчымага. І тэатр таксама — мастацтва магчымага. Сур'ёзнае мастацтва — гэта калі ты ўлічваеш усе бакі.

— У чым вы бачыце задачы тэатра?

— Задачы тэатра? Густ. Асветніцтва. Адукацыя.

— А калі гаварыць пра ўласна тэатральную адукацыю? Вы ж выкладалі і выкладаеце ў Акадэміі мастацтваў. Чаго не хапае сённяшнім абітурыентам, а потым студэнтам — толькі большага конкурсу пры паступленні?

— Акцёр, рэжысёр, тэатразнаўца — гэта сёння не прафесіі, бо на іх не пражывеш. Вось і ўсё!

— Цяперашнія студэнты змяніліся ў параўнанні з ранейшымі?

— Канешне! Чытаць перасталі. Але моладзь у тым не вінаватая. Ды што там казаць, калі ўсё змянілася! Адукацыя, бацькі, сам стыль жыцця. Адбылася своеасаблівая

Фінал рэспубліканскага конкурсу "Музыка дзіцячай душы" пройдзе **23 сакавіка** ў Канцэртнай зале "Верхні горад".

"дэбілізацыя" насельніцтва. І людзі ў тым зусім не вінаватыя. Усе яны ёсць прадукт таго, што з імі зрабілі.

— Але хто зрабіў? Тое ж тэлебачанне адказвае, што паказвае гледачам тое, што яны хочуць убачыць.

— А культура ўводзіцца ў свядомасць людзей палкай, дубінай, а не па прынцыпе: "чаго пажадаеце"? Калі чалавек абірае паміж забавай і сур'ёзнай гісторыяй, ён заўсёды абярэ забаву. Між пляшкай гарэлкі і сур'ёзнай кнігай — таксама большасць абярэ гарэлку. Таму ўсялякія хіт-парады, рэйтынгі — лухта. Ёсць дзяржаўная палітыка ў галіне культуры — гэта ў некаторым сэнсе палка, гэта дубіна. Толькі так уводзіцца сур'ёзная адукацыя, стаўленне да нацыі. Вы ж не кажаце камусьці з падначаленых у арміі: "Калі ласка, выканай мой загад. Выканаеш? Не? Не хочацца? А можа, усё-такі выканаеш? Ну я цябе вельмі прашу!". Дэмакратыя ў гэтым сэнсе — дрэнная рэч. Мастацтву было б няблага пераняць некаторыя законы бізнесу. У прыватнасці, такі: спачатку трэба ствараць не прадукт, а яго спажыўца. Мы нават не ведаем дакладна, хто ён — наш спажывец. Ці вяліся калі-небудзь сур'ёзныя навуковыя даследаванні на гэту тэму? Асабіста я не памятаю. Таму і адбываюцца неспадзяванкі. А ў свеце такія даследаванні робяцца. І ёсць статыстыка. Не самая суцяшальная, дарэчы. Паводле яе, ва ўсім свеце (падкрэсліваю, не ў Беларусі, а па ўсім свеце) у тэатр ходзіць не больш як сем адсоткаў насельніцтва. Так што разлічваць на татальную цікавасць — па меншай меры, дзіўна.

— І што застаецца?

— Спрабаваць спалучаць лёгкае з сур'ёзным. Вось паставіў я, да прыкладу, "Местачковае кабарэ" — вельмі паспяховы, з камерцыйнага погляду, праект. Спевы, жарты, жывы "маленькі аркестр", Віктара Шалкевіча запрашаем з некалькімі яго аўтарскімі песнямі. Прыцягвае, мабыць, і назва — "…Кабарэ". Але гэта яшчэ і наша гісторыя. Ведаю дакладна, што такія кабарэ былі ў першай палове XX стагоддзя ў Пінску, Гродне дый па ўсёй Заходняй Беларусі. Дык што гэта ў выніку — толькі забава? Не.

— Вы казалі, што з боку дзяржавы фінансуецца ўсяго адзін спектакль на год. Ці магчыма сёння пры такім падыходзе ставіць за дзяржаўныя грошы спектаклі эксперыментальныя?

— Дзяржаўныя тэатры за дзяржаўныя грошы павінны праводзіць дзяржаўную палітыку. Біць па руцэ, якая выдаткоўвае табе фінансавую падпітку, — дурное выхаванне. Але ў дэмакратычным грамадстве заўсёды існуе іншая пазіцыя — дзеля нармальнай, добрай канкурэнцыі, прынамсі. Якая ж яна ў тэатральным мастацтве? Здавалася б, усё проста: з аднаго боку — дзяржаўныя тэатры, з другога — недзяржаўныя, вольныя. Вось і канкурыруйце паміж сабой! Але ж ці магчыма гэта? Пасля таго, як недзяржаўны тэатр аплоціць усе арэнды, падаткі і іншыя расходы, што яму застанецца? Вось і ставяцца там пераважна камерцыйныя праекты. А значыць, ніякай канкурэнцыі няма. Здавалася б, для падтрымкі лепшага, перадавога існуюць прэміі. У савецкія часы іх атрымлівалі многія артысты. Але па тых часах на Дзяржаўную прэмію можна было набыць, скажам, тры аўтамашыны — "Победа". Калі ж я ў 1990-я атрымліваў Дзяржаўную прэмію за спектакль "Тутэйшыя", дык мог набыць за яе — дваццаць пляшак гарэлкі. Адчуваеце розніцу? Любая ідэалогія дорага каштуе! Мабыць, раней гэта разумелі лепей? Ці ацэньвалі яе вышэй? Не ведаю…

— Крызіс вінаваты! Тым не менш, з'явілася Нацыянальная прэмія ў галіне тэатральнага мастацтва, праводзілася яна ўжо тройчы.

— Сёлета яна ладзілася на базе нашага тэатра. Першае, што я змяніў, — гэта прызавую статуэтку: замест Купалінкі, калі памятаеце, усе атрымлівалі буслоў. Але ў мяне ёсць і больш грунтоўныя прапановы. Ведаю, што гэтую думку не падтрымалі, але выкажу яе яшчэ раз. Трэба вярнуцца, як гэта было раней, да "сістэмы акадэмікаў", куды ўваходзілі б прадстаўнікі ўсіх тэатраў краіны. Гэткая галівудская форма, калі прафесіяналы даюць прэмію прафесіяналам. А пакуль журы будзе малаколькасным (не мае значэння, што ў ім прызнаныя крытыкі, мастацтвазнаўцы, прафесары, дзеячы культуры), пакуль прызначаць яго будзе Міністэрства культуры, у ім будзе панаваць прынцып "размеркавання": усім сястрыцам — па завушніцах. Ведаю, што на першых прэміях многіх збянтэжыла тое, што адзін чалавек — той жа Аляксандр Гарцуеў, а потым Алег Жугжда — "збіраў" ледзь не ўсе ўзнагароды за свае пастаноўкі. Але гэта было адлюстраваннем рэчаіснасці! Больш за сто чалавек не маглі ўсе паміж сабой дамовіцца. І галоўнае: калі склад журы прызначаецца загадам, дык застаецца спакуса кіраваць "падначаленымі". Калі б журы прызначаў я, дык таксама, пэўна, намагаўся б ім кіраваць! Нармальныя асаблівасці чалавечай псіхалогіі. Таму, лічу, у правядзенні Нацыянальнай тэатральнай неабходна працягваць шукаць лепшыя арганізацыйныя варыянты. Інакш прэстыж яе рэзка ўпадзе. Ужо сёлета даводзілася чуць меркаванні: маўляў, калі так пойдзе і далей, дык ці ёсць сэнс ва ўсім гэтым удзельнічаць? Бо вынікі і так усім зразумелыя, ніякай інтрыгі. А нечаканыя вынікі прэміі — што можа быць лепей?..

— У Міністэрства культуры ёсць прапанова назваць 2016-ы Годам культуры. Якія, на вашу думку, мерапрыемствы маглі б адбыцца ў яго межах?

— Не ведаю. Найперш — вельмі сур'ёзнае фінансаванне. Магу такі прыклад прывесці. У Расіі некаторы час таму ў такі Год у мэтах падтрымкі культуры адкрылі Федэральнае гастрольнае агенцтва. Уявіце, ці паехаў бы сёння які-небудзь маскоўскі тэатр, дзе скрозь кіназоркі працуюць, сам па сабе на працяглыя гастролі куды-небудзь у Бурацію? Ды навошта ім гэта? А праз гэтае агенцтва — калі ласка. Той жа МХАТ на месяц паехаў ва Улан-Удэ. Пад гэты расійскі Год культуры наш тэатр таксама запрасілі — у Томск, дзе купалаўцы былі ў вайну пад час эвакуацыі. Што значыць "запрасілі"? Аплацілі самалёт, фуры з дэкарацыямі, гатэль. І мы паказалі там тры спектаклі. Ці змаглі б мы самі туды паехаць? Не. Так што Год культуры — гэта найперш грошы. А праграму зрабіць няцяжка. Варыянтаў можа быць — безліч! Але ўсё звычайна сыходзіць з колькасці грошай. Што ж да ідэй, дык у мастацкіх калектываў іх заўсёды багата.

— Адзін з маскоўскіх творцаў расказваў, як яго запрасілі ў Японію паставіць спектакль. Там, дарэчы, існуе традыцыя паказваць прэм'еру не сезон, а ўсяго раз ці два. Праект фінансаваў буйны бізнесмен, і зала была цалкам запоўнена школьнікамі. Яго запыталі: маўляў, навошта ўсё гэта? Яны ж у такім узросце наўрад ці той спектакль да канца зразумеюць. А той адказаў, што калі сярод іх знойдуцца хаця б два чалавекі, якія праз гады прыгадаюць той спектакль і пад гэта пачуццё зробяць штосьці добрае, дык у гэтым і ёсць сэнс такой акцыі. Ці магчыма штосьці падобнае ў нас?

■ "Яшчэ зусім нядаўна ўсё было зразумела: дастаткова сказаць, што камуністы дрэнныя, а дэмакраты добрыя, што Савецкі Саюз — турма, і ўсё — спектакль адбыўся. **А пра што гаварыць з гледачом сёння**, калі ўсе ўсё ведаюць і калі так рэзка змяняецца чалавечая свядомасць? Адбываецца гэта таму, што змянілася сама інфармацыйная прастора. Такіх змен не было на працягу жыцця ўсяго чалавецтва!"

■ "Само жыццё — гэта ўжо кампраміс. І кожны сам вырашае, як яму рабіць: **ісці на кампраміс ці не.** І ў кожнага, пэўна, будзе свая праўда. Дыпламатыя — гэта мастацтва магчымага. І тэатр таксама — мастацтва магчымага, а не немагчымага. Сур'ёзнае мастацтва — гэта калі ты ўлічваеш усе бакі".

■ "Здавалася б, усё проста: з аднаго боку — дзяржаўныя тэатры, з другога — недзяржаўныя. Вось і канкурыруйце паміж сабой! Але ж ці магчыма гэта? Пасля таго, як недзяржаўны тэатр аплоціць усе арэнды, падаткі і іншыя расходы, што яму застанецца? **Вось і ставяцца там пераважна камерцыйныя праекты.** А значыць, ніякай канкурэнцыі няма".

— Я таксама, калі штосьці стаўлю, заўсёды разлічваю на тое, што ўся зала, пэўна, і не прыгадае праз час гэты спектакль, а тры — чатыры чалавекі — успомняць. І калі студэнтаў выхоўваю — таксама: бачу, што ўсе яны не зразумеюць таго, што я ім даю, але спадзяюся, што знойдзецца хтосьці, для каго гэта будзе важна.

— А як тады "дубіна"?

— Гэта, вядома, метафара, якая мае на ўвазе моцную дзяржаўную палітыку, скіраваную на выхаванне.

— Тыя ж культпаходы школьныя — чым не прыклад "дубіны"? Прымусілі — і ўсе пайшлі. Але ж ці ёсць ад гэтага аддача? Ці не атрымліваецца наадварот: у дзяцей і падлеткаў усё прымусовае выклікае непрыняцце.

— У нашым тэатры зараз культпаходы не практыкуюцца. Ёсць школьнікі на спектаклях — звычайна старэйшыя, а культпаходаў няма. Каб дзеці, як у ранейшыя часы, прыходзілі ў ТЮГ і стралялі з рагатак па артыстах, якія гралі немцаў, — такога не трэба. Яны павінны прыходзіць у тэатр з бацькамі і потым разам абмяркоўваць убачанае.

— Некаторыя расійскія тэатры, каб змагацца з "культпаходамі", ніколі не прадаюць школам усе месцы побач. А размяркоўваюць тыя квіткі па ўсім зале, каб дзеці не адчувалі сябе гэткай "масоўкай", каб не дзейнічала паміж імі ў час спектаклю псіхалогія натоўпу.

— У Прыбалтыцы ў тэатрах даўно адмовіліся ад "культмасавых" наведванняў, падтрымліваюць толькі сямейныя прагляды дзіцячых спектакляў.

— У тыя ж 90-я тэатр так і ўспрымаўся — падставай для роздуму і далейшага абмеркавання. А сёння для большасці гледачоў гэтай найперш "культурнае мерапрыемства": схадзілі ўсёй сям'ёй ці калектывам — значыць, "адзначылі". І рухае гэтым не прага да тэатра, а нейкае "павышэнне" свайго статусу: маўляў, і я там быў. Вы адчуваеце, які зараз глядач у Купалаўскім тэатры?

— Я не ведаю дакладна, хто да нас ходзіць. Такія сацыяльныя апытанні, здаецца, не рабіліся. Але ўпэўнены, што сярод публікі ёсць абсалютна розныя людзі. Іншы раз бачу, што ўсе ўсё зразумелі, у іх светлыя вочы, горача вітаюць артыстаў пасля спектаклю. А бывае — на першых апладысментах усталі і пайшлі. Абсалютна абыякавыя. Гэта далёка не заўсёды залежыць ад якасці спектакляў, ад ігры акцёраў — публіка таксама бывае розная. Як і ўсё наша грамадства. У тыя ж 1990-я беглі на "Тутэйшых" не толькі дасведчаныя інтэлігенты, якія ведалі пра п'есу, а літаральна ўсе, прачнулася нейкая самасвядомасць, было жаданне ўбачыць, што гэта такое. І так — па ўсім Савецкім Саюзе: прага да тэатра стала вялікая. Сёння глядач і сапраўды змяніўся — зноў-такі, як і ўсё грамадства. Бо іншая інфармацыйная прастора!

— Ці магчымы сёння той студыйны рух, які быў у 1990-я? Ці, як некаторыя лічыць, ён перарос у камерцыйныя праекты?

— Інтэрнэт усё змяніў. Людзі сядзяць у Сеціве — навошта ім тэатр? А ў 1990-я існавала запатрабаванасць. Да таго ж, аб'ядноўвацца ў групоўкі вакол нейкіх ідэй — гэта справа маладых. Мне сёння нецікава ні з кім аб'ядноўвацца. А калі ўсе мы студэнты, калі ўсе разам, калі хочам абмяркоўваць жыццёвыя праблемы і запрашаць да размовы аўдыторыю — такое патрабаванне душы і спрыяла студыйнаму руху. Тэатр бурліць, у ім узнікае разгалінаваная студыйная сетка, калі грамадства патрабуе перамен. Паглядзіце, калі ў той жа Расіі быў моцны тэатр? У перадрэвалюцыйны-паслярэвалюцыйны час, у 1960-я гады, 1990-я. А паміж імі такіх выбухаў тэатральных няма. Да таго ж, студыйны рух — гэта таксама не толькі ідэі, але і грошы, якія хтосьці павінен выдаткаваць. У 1990-я людзей, гатовых укласці ў ідэі, было больш: усё грамадства жыло прадчуваннем змен.

— Вы згадалі Інтэрнэт як гэткую альтэрнатыву тэатру. Няўжо вы лічыце, што яны не могуць "супрацоўнічаць"? Той жа тэатр мог бы выкарыстоўваць магчымасці Сеціва на сваю карысць.

— Ніхто не аспрэчвае Інтэрнэт як сродак інфармацыі! Вось і мы зрабілі зараз новы сайт. А як сродак камунікацыі — тэатр і Інтэрнэт знаходзяцца на розных полюсах. У тэатры ёсць жывы чалавек. А маладыя зараз нават кахаюць праз Сеціва. Але ўсё роўна: як толькі ў грамадстве пачынаюцца зрухі, узнікае жаданне іх абмяркоўваць — не важна, праз што, праз Інтэрнэт ці тэатр. Зараз такіх глыбінных зрухаў няма — ёсць хіба дробныя навіны. Таму і тэатр не на ўздыме агульнаграмадскай увагі. І гэта не толькі ў нас, але і па ўсім свеце.

— Вы цікавіцеся тым, што робіцца ў замежжы? Глядзіце спектаклі сваіх калег ў Беларусі?

— Тэатр апошнім часам стаў мяне мала цікавіць. І гэта не смешна! Я сур'ёзна кажу. Я паставіў у сваім жыцці 70 спектакляў, а паглядзеў — памножце названую лічбу на тысячу. Гэта прафесійная стомленасць. І гэта — мая асабістая праблема, а не праблема тых спектакляў, якія я глядзець не хачу. Я не абавязаны цікавіцца тым, што ў маім узросце мяне не цікавіць. Як і іншыя не абавязаны цікавіцца тым, што блізка мне. Узрост — гэта калі ў вас няма простых адказаў на складаныя пытанні. І гэта прыводзіць да таго, што вы ўжо не можаце дзейнічаць, бо ўлічваеце ўсё. І чым больш вы намагаецеся ўлічыць аргументаў "за" і "супраць", тым больш не можаце зрушыць з месца. Хтосьці калісьці неяк сказаў, што для найбольш актыўнай дзейнасці патрэбна энергія "заблуждения", калі па-руску. У тыя ж 1990-я ўсе мы свята верылі, што дастаткова скінуць камуністаў — і ўсё адразу будзе добра. Сёння мы глядзім на рэчы больш цвяроза. І разумеем, што імгненных змен, асабліва ў чалавечай свядомасці, з якой усё пачынаецца, не бывае. Так што ўсё заканамерна…

Апошнім часам мяне куды больш цікавіць і прыцягвае прырода — у той жа вёсачцы на Ушаччыне, дзе я адпачываю. Жыццё ўвогуле больш цікавае, чым усе размовы пра яго!

— Напрыканцы — крыху смешнае пытанне, што нарадзілася, калі мы збіраліся на гэтую сустрэчу. Гледзячы на артыстаў, вы звычайна як прафесіянал прыкідваеце, што маглі б на іх паставіць. А што вы маглі б паставіць на творчы калектыў нашага штотыднёвіка?

— Дзіўная кампанія, не ведаю. Але каб ставіць, трэба спачатку трохі папрацаваць з гэтымі людзьмі, даведацца пра іх магчымасці. Так што пакуль — не, не ведаю.

К

Нацыянальны гістарычны музей першым далучыўся да міжнароднай твітар-акцыі #MuseumWeek-2015, што пройдзе **23 — 29 сакавіка.**

З 25 па 27 сакавіка ў сталічным кінатэатры "Перамога" адбудуцца **Дні латвійскага кіно ў Беларусі**.

Цудоўныя мясціны вакол Бабаедава (раней Бобіна) — палі з хлебам, узгоркі з духмянымі канюшынай і медуніцай — зачароўвалі і мілавалі вока. А ў самой вёсцы над сялянскімі хаткамі ўзнімаліся старыя ліпы. Яны ледзь не цалкам хавалі ў сваім ценю некалькі драўляных хатак жыхароў. Вось табе гатовы пейзаж — бяры і перанасі яго на паперу. Бадай, першым яго заўважыў Ваня Бабаедаў, сын аднаго з трох дзяцей Цімафея Мінавіча Бабаедава, удзельніка Грамадзянскай вайны.

Іван Бабаедаў. "Дахаты".

Перавагу аддаў пейзажу

“Мара стаць мастаком у мяне зарадзілася яшчэ калі вучыўся ў Новачаўнышанскай сямігодцы”, — успамінаў пазней Іван Цімафеевіч. “Цяжкі шлях яму давялося прайсці, перш чым дабіцца прызнання, — піша ў пісьме да жонкі і сына мастака яго родная сястра Надзея. — У дзяцінстве мы жылі бедна. У школу ў Чаўнышкі хадзілі за тры кіламетры, адзеты былі дрэнна, не заўсёды бачылі кавалак хлеба…”

Пасля заканчэння школы Іван вырашае паступаць у Віцебскае мастацкае вучылішча, але пачалася вайна. А ў 1944-м 19-гадовы Бабаедаў адпраўляецца на фронт. Тры раненні, два з якіх цяжкія, не пахіснулі ў ім імкненне стаць мастаком. Іван Цімафеевіч паступае ў Сімферопальскае мастацкае вучыліша, а праз тры гады пераводзіцца ў Мінск, дзе трапляе ў клас вядомага пейзажыста Віталя Цвіркі. У сталіцы Бабаедаў адразу трапляе ў мастацкае жыццё, удзельнічае ў выстаўках. У 1952 годзе былы франтавік прадстаўляе на суд экзаменацыйнай камісіі дыпломную работу “Пераправа савецкіх войск праз Заходнюю Дзвіну ў Бешанковічах. 1944 год” і атрымлівае выдатную адзнаку, а разам з ёй накіраванне на пасаду выкладчыка ў Віцебскае мастацка-педагагічнае вучылішча. Тут найбольш поўна і ярка раскрыліся яго мастацкія і педагагічныя здольнасці. Гэта прынесла заслужаны аўтарытэт не толькі сярод прадстаўнікоў віцебскай багемы, але і між студэнтаў.

І ўсё ж поўнага задавальнення ад педагогікі Іван Цімафеевіч не атрымліваў — цягнула ў родныя мясціны. А калі пераехаў, то ў мастака адразу адкрылася другое дыханне. Ён працуе апантана. Пацвярджэнне таму — новыя пейзажы, дзе занатаваны палі, лясы па берагах Дзвіны, спакойная раніца, абуджэнне прыроды, ціхія вечары пры заходзе сонца. Яшчэ яго захапляла рэстаўрацыя старажытных іканастасаў у мясцовай Свята-Ільінскай царкве, аднаўленне лікаў святых, што значна ўзбагачала творчую натуру, натхняла на новыя пошукі ў раскрыцці сакрэтаў старога жывапісу. Словам, ён поўнасцю аддаецца мастацтву. Па-ранейшаму яму больш па душы тутэйшыя краявіды. Менавіта ад іх ён спазнае натхненне і асалоду, унутраны спакой. А яны патрабуюць трывалых ведаў.

Таму нягледзячы на ўзрост, Іван Цімафеевіч паступае на мастацкі факультэт Віцебскага педінстытута. У 1976-м пасля заканчэння пачынае актыўна ўдзельнічаць у рэспубліканскіх выстаўках. Гледачам падабаецца ўменне аўтара перадаць характво і непаўторнасць бешанковіцкай зямлі, яе ўзлескі, лясы, старажытныя курганы, паўразбураныя храмы, высокія і пакатыя берагі Дзвіны, Улянкі, Свячанкі. Адметна, што большасць іх напісана непасрэдна на прыродзе: “Апошні снег”, “Сакавік. Лазенька”, “Лютаўскі дзень”, “Пачатак зімы”, “Лясная вырубка”, “Сакавік у лесе”, “Вечар на Дзіве”, “Летні вечар. Вёска”, “Вось. Лясныя далі” і сотні іншых.

Нястомны працаўнік, Бабаедаў не разлучаўся са сваім заняткам нават у час хваробы. Але яна перамагла — паважаны Іван Цімафеевіч пайшоў з жыцця ў дзень свайго нараджэння, у апошні дзень лютага 2002 года… Але засталася вялікая спадчына Майстра — каля 600 работ. Некаторыя дагэтуль дэманструюцца на выстаўках у Мінску, Віцебску, а таксама на радзіме — ва ўстановах культуры райцэнтра, дзякуючы стараннаю яго сына Васіля Іванавіча Бабаедава. Менавіта ён пасля смерці брата і маці стаў галоўным захавальнікам вялікай і каштоўнай спадчыны Мастака.

Мяркую, было б справядлівым надаць імя кавелера ордэнаў Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў, Чырвонай Зоркі і медаля “За адвагу”, вядомага творцы мастацкаму аддзяленню школы мастацтваў, паколькі тут, у колішняй сярэдняй школе, Іван Цімафеевіч доўгі час выкладаў чарчэнне і маляванне, а ў вёсцы Бабаедава, на месцы хаты, дзе ён нарадзіўся (там цяпер пустэча), паставіць памятны знак — валун з адпаведнай шыльдачкай…

Анатоль КРАЧКОЎСКІ

Можна напісаць і водар

Даўно заўважаю, што ў розных мастакоў адны і тыя ж кветкі глядзяцца зусім па-рознаму. І чым больш таленавіты мастак, тым гэтая розніца больш адчувальная. Уражанне такое, што ўвасабляюцца партрэты кветак, а гэта ўжо не толькі аблічча, нават самае прыгожае. Гэта яшчэ і характар, і лёс, і тыя псіхалагічныя адценні, якія кожны бачыць або адчувае па-свойму. А калі партрэт, то ён павінен быць такім, каб з ім і паразмаўляць можна было. Кветкі пісалі, пішуць і будуць пісаць, але памятаючы, што амаль усё ўвасобленае мае адносіны непасрэдна да малюнка. Невыпадкова Мікеланджэла аднойчы ўсклікнуў: “Хто валодае малюнкам, той гутарыць з Богам!” Сёння на такое здольны нямногія.

Алена Карповіч. "Аранбіны".

Нацюрморт: не толькі кветкі

Асабліва прыемна, калі сустракаеш карціны, вартыя знакамітага творцы, а належаць яны чамусьці амаль невядомаму. Наўрад ці памылюся, калі скажу, што і Алену Карповіч няшмат песцілі і песцяць ўвагай. Ды і выстаўкамі не надта “абцяжарвалі”. Гэта прытым, што яна ў свой час паспяхова скончыла нашу Акадэмію мастацтваў, з’яўляецца членам Беларускага саюза мастакоў.

Экспазіцыя, што адкрылася зараз у Светлагорскай карціннай галерэі “Традыцыя” імя Германа Пранішнікава, — ці не першая яе персанальная за апошняе дзесяцігоддзе. Называецца яна крыху нечакана: “Хутка — лета”. Зрэшты, назву маглі падказаць і кветкі, акварэльныя ўвасабленні якіх таленавіта партрэтуе мастачка. Уладарна падпарадкаваўшы сабе дзвюхзальную прастору, яны ў гэтыя першыя веснавыя дні сапраўды пераконваюць у блізкасці кветкавай пары года. Прытым, па-рознаму, у адпаведнасці са сваім адметным характарам, якім пераканаўча надзяліла іх мастачка. Выказваюць нецярплівасць блакітна-нябесныя незабудкі, прыспешваюць ярка-пунсовай чырванню цюльпаны, прадчуваюць прымеркаванасць да нейчага дня нараджэння сонечна-светлыя ружы. І ўжо зусім гарэзліва набліжаюць нас да лета ружовыя… рамонкі. Нешта майскае адчуваецца ў праяснёна-блакітнаватых фіялках і крыху ліпеньскае - у насцярожаных ад нашых позіркаў званочках… А вось ужо адчуваем і тое, як пахне чабор… Дарэчы, так і называецца адзін з акварэльных твораў. Светла-фіялетавы водар? Так, Алена Карповіч можа, аказваецца, напісаць і водар… Нават сабраныя ў букет або сплеценыя ў вянок, кветкі не губляюць свайго незалежнага аблічча.

—Я не згодная з тым, што нацюрморт — спыненае жыццё,— разважае мастачка. — Яно, можа, крыху і запаволенае, але рухомае. Нацюрморт дыхае, разважае, нагадвае нешта запаветнае. У ім свая недасказанасць, свой падтэкст.

Самы хуткі жанр выяўленчага мастацтва, якім лічаць акварэль, яна таму і абрала, што ён загадкава непрадказальны. Але акварэль заўжды падказвае таленту нешта такое, што патрабуе імгненнай рэакцыі. І тут трэба падпарадкоўвацца, не падпарадкоўваючыся. Паспець як мага хутчэй надаць свавольству фарбаў сваю волю, сваю задуму.

— Небяспека ўпусціць, страціць нешта вельмі істотнае заўжды існуе,— пагаджаецца мастачка. — Аднак я ведаю, чаго хачу, які колер мне патрэбен, і дасягаю жаданага.

Акварэль аб’ядноўвае ў сабе ці не ўсе магчымасці жывапісу і графікі. Гледзячы на карціны Алены Карповіч, пераконваешся ў справядлівасці такога вызначэння. Тут і багацце таноў, і аб’ёмнасць каляровага адчування, і актыўная роля паперы… Аднак галоўнае ўсё ж — малюнак.

Мяркуючы па лепшых нацюрмортах (“Цюльпаны”, “Сонечны дзень”, “Падарунак лета”, “Ружовыя рамонкі”, “Пахне чабор”, “Зялёныя яблыкі”), свае жаданні яна ўмее ўвасабляць ва ўсёй таленавітай разнастайнасці. Зрэшты, выстаўка засведчыла і іншыя магчымасці яе мастацкага дыяпазону. Гэта акварэльны цыкл эцюдаў “Браслаўшчына” і шэраг графічных твораў паводле славутай паэмы Міколы Гусоўскага “Песня пра зубра”. І ў іх — ужо знаёмая пластыка, псіхалагічная дакладнасць адухоўленага малюнка. Яе “Рым”, “Бунтарка”, “Вакацыі”, “Купальская ноч”, “Туманны ранак” вымушаюць задумацца аб незвычайных магчымасцях алоўка.

Што і казаць, парадавала Алена Карповіч светлагорскіх аматараў выяўленчага мастацтва не толькі партрэтамі кветак.

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ,
мастацтвазнаўца
Светлагорск

Леў Дашкевіч. "Лясны пейзаж" (Барысаўскі раён).

Леў Дашкевіч. "Партрэт жонкі Зінаіды Ануфрыеўны".

Брамойль, гуматыпія, тэмперапрынт… Усё гэта не назвы замежных лекаў, а своеасаблівыя тэхнікі фатаграфіі, пазнаёміцца з якімі прапануе Нацыянальны гістарычны музей Беларусі на выстаўцы “Альтэрнатыўная фатаграфія Беларусі. Сувязь часоў”. Творы класіка беларускай фатаграфіі Льва Дашкевіча і сучаснага “рыцара піктарыялізму” Віктара Жураўкова, спалучаныя ў адной выставачнай прасторы, дэманструюць асаблівасці выкарыстання розных тэхнік і — актуальнасць апошніх для творчага выказвання і сучасных фатографаў.

Дар’я АМЯЛЬКОВІЧ

Фатаграфія тэхнік

Рэпліка на тэму альтэрнатывы

Віктар Жураўкоў. "Сядзіба Хмараў у Сёмкаве".

Разабрацца ў гэтым і сапраўды цікава. Тая ж гуматыпія — гэта каўчукавы друк, сутнасць якога ва ўласцівасці каўчука пад уздзеяннем святла змяняць ліпкасць слою і ў большай ці меншай ступені — прымаць фарбу. Тэмперапрынт — друк фатаграфій на аснове яечнага жаўтка, які дазваляе атрымоўваць выяве любое адценне, бо малюнак ствараецца паступова, слой за слоем. Калі ў якасці пігмента выкарыстоўваецца смаленая сажа — пігментны друк, — падобныя адбіткі вядомыя сваёй цёмнай палітрай. А мяккія выявы, падобныя да жывапісных твораў — гэта выкарыстанне такой тэхнікі як брамойль, якая мае на ўвазе адбельванне і дубленне жалаціны двухромавакіслымі салямі.

Гэтыя невялікія тлумачэнні, пазначаныя стваральнікамі выстаўкі, даюць магчымасць атрымаць агульнае ўяўленне пра альтэрнатыўныя тэхнікі, якімі карыстаюцца фатографы, і распазнаць іх. Дапаўняе гэтыя “ўводзіны ў прадмет” і адмысловы дакументальны фільм, дзе дэталёва паказаны этапы таго ці іншага працэсу.

— Наведвальнікі свядома прыходзяць на выстаўку, каб пазнаёміцца з тэхнікамі. Асабліва маладыя людзі застаюцца на фільм, каб ва ўсім разабрацца, — кажа наглядчыца залы, вылучаючы трэнд у сучаснай фатаграфіі, калі тэхнікі стогадовай даўніны па ранейшаму актуальны.

Звычайная лічбавая фатаграфія блізкая далёка не ўсім, і многія сучасныя аўтары арганічна выходзяць на піктарыялізм, калі ў выніку адмысловых прыёмаў, у тым ліку з лічбавымі негатывамі, выява атрымлівае выгляд жывапіснага твору. Віктар Жураўкоў, творы якога прадстаўлены на выстаўцы, прапаноўвае свой погляд на фатаграфію, якую прынята называць жывапіснай.

Якога ж кшталту гэта жывапіснасць? Віктар (так і хочацца сказаць “піша”) захоўвае на сваіх работах, у асноўным, помнікі. Беларускай архітэктуры — “Барысаглебская царква. Забороддзе” (тэмперапрынт), “Замак Альгерда. Крэва”(тэмперапрынт), “Касцёл Св. Архангела Міхаіла. Івянец”(тэмперапрынт), іспанскія і французскія славутасці — “Новы мост. Парыж” (гуматыпія), “Таледа. Мост Алькантара” (тэмперапрынт)… Праз розныя тэхнікі і колер надаючы адмысловы настрой твору, фатограф, абапіраючыся на фатаграфічную выяву, працуе з рэльефам малюнка — так можна апісаць манеру Віктара Жураўкова. Фатаграфіі аўтара дасылаюць да гравюр Напалеона Орды, Тамаша Макоўскага… Гэта — стыль мастака-пленэрыста з бліскучым валоданнем рознымі тэхнічнымі сродкамі.

У якія стасункі ўключаецца сучасны аўтар побач з творамі класіка беларускай фатаграфіі Льва Дашкевіча?

Невялічкае адступленне. Леў Дашкевіч, фатограф, педагог, — адзін з першых піктарыялістаў Беларусі. Ён скончыў факультэт славеснасці Дзюжонскага ўніверсітэта, фатаграфічнае аддзяленне вышэйшай школы графічных мастацтваў у Парыжы, і, як ніводзін з фатографаў той пары, працаваў з альтэрнатыўнымі тэхнікамі. З 1920 гадоў ён быў выкладчыкам у Мінскім інстытуце народнай адукацыі. І яго выкладанне ўключала ў сябе знаёмства з альтэрнатыўнай фатаграфіяй.

Магчыма, названыя падрабязнасці і не маюць значэння, але першае, што адзначаеш, убачыўшы творы майстра, — яго працу са святлом. Выкарыстанне адмысловых тэхнік выглядае тут не толькі пошукам найлепшай формы для перадачы настрою, але і адлюстраваннем усёй разнастайнасці прыроды святла.

Напрыклад, у фотаздымку “Лясны пейзаж”, дзе выкарыстоўваецца брамойль, ён фіксуе мяккае святло леса, яго ласкавую лагоднасць. “Ноч ціхая” (таніраванне) дасылае да летніх сіне-блакітных змярканняў, а “Партрэт жонкі Зінаіды Ануфрыеўны” (таніраванне) — поўны паветра і сонечнай цішыні. Так бы мовіць, гістарычны дакумент “Мінск. Від на Верхні горад” (таніраванне), зроблены ў 1920 — 1930 гады, дзе камера Дашкевіча захоўвае на фотаздымку верхавіны трох храмаў, — яшчэ і выразная гравюра… Словам, арыгінальныя здымкі Льва Дашкевіча, якія з’яўляюцца перлінамі калекцыі Нацыянальнага гістарычнага музею, — уражваюць не толькі сваёй аўтэнтычнасцю, але і мастацкім пасылам.

Што дае гэта параўнанне аўтараў? Несумненна, як адзначаецца ў анатацыі, спалучэнне фатографаў у адной прасторы, не толькі перадае “сугучнасць творчых памкненняў двух майстроў”, але праводзіць лінію спадкаемнасці беларускай фатаграфіі. Тым не менш, на маю думку, выстаўку можна было прадоўжыць іншымі творамі сучасных піктарыялістаў, адзначаных у анатацыі — Альберта Цэхановіча, Наталлі Яўмеенка, Максіма Шуміліна, Міхаіла Лешчанкі, Марыі Банэ ды іншых, каб убачыць разнастайнасць аўтарскага выкарыстання альтэрнатыўных тэхнік. І, прызнацца, штосьці падобнае рабіў пэўны час таму Яўген Казюля на выстаўцы “Фатаграфічная палітра” ў Музеі гісторыі горада Мінска, праўда, без увасобленай гістарычнай паралелі. Магчыма, варта падумаць пра падобны больш маштабны фармат, дзе беларускія класікі піктарыялізму выступяць “суправаць” сучаснікаў?

Пакуль жа “Альтэрнатыўная фатаграфія…” выглядае невялікай рэплікай на, як бачым, па-ранейшаму актуальную тэму.

K

A&B: Аўдыя & Відэа

Лютаўскія аўдыя- і відэапрацы айчынных выканаўцаў рэцэнзуюць гітарыст гуртоў “Нейра дзюбель” і “Змяя” Уладзімір САХОНЧЫК (А.) і спецыяльны карэспандэнт газеты “Культура” Алег КЛІМАЎ (В.).

АЎДЫЯ

Георгій Дабро, міні-альбом “Энергія”

А.: Вельмі спецыфічная творчасць. Сцёб над пацанамі, якія ездзяць на “геліку” і вырашаюць пытанні... А на каго яшчэ разлічаны гэтыя ноты і словы? Чые сэрцы яны могуць зачапіць?.. А можа, Георгій выступае тут у ролі Міхаіла Шуфуцінскага або Стаса Міхайлава?.. Ды, па шчырасці, я б сваёй маме не рызыкнуў уключыць гэтыя творы.

Рэха “хвацкіх 90-х,” напэўна, абумоўлена жаданнем

зрабіць “як у тыя добрыя часы”, часы маладосці Георгія. Калі людзі выходзілі на двор, сябравалі цэлымі пад’ездамі, спявалі хорам песні. Абдымаліся пры сустрэчы, цалаваліся ў шчочкі. “Сёння зноў на працу не пайду, застануся ў гэтай казцы назаўжды” — запамінальныя словы, якія праспявае кожны другі. У прынцыпе, даступная лірыка. Хаця, баюся, людзі, якія слухаюць шансон, у большасці сваёй кансерватыўныя. Міхаіл Круг шчыльна засеў у іх свядомасці на стагоддзі. Ды і кавер “Nirvana” — “Lithium” — прыхільнікі Курта Кабэйна наўрад ці ацэняць.

Хочацца пажадаць Георгію больш карпаратываў. Там, глядзіш, і грошы з’явяцца, “чоткае” відэа — і ў тур па Расіі. Ды і ў нас Палац Рэспублікі можна раз на год збіраць.

В.: Не ведаю, ці можна назваць гэтага выканаўцу, яго творчасць alter ego Сяргея Пукста, таго, што ён робіць, але за псеўданімам “Георгій Дабро” хаваецца менавіта вядомы айчынны альтэрнатыўны музыкант. Песні Георгія многія слухачы расцэньваюць як творчую правакацыю, памятаючы пра тое, што Пукст спявае і грае зусім не папсу. У гэтым жа выпадку Дабро яе і дае, і не абы якую, а сапраўдны шансон. Але — “пукстаўскага” разліву. Ён і здзекліва прымітыўны, — што ў мелодыях, што ў аранжыроўках, — і багаты на вербальныя штампы, і... наскрозь пранізвае сэрцы ўражлівых паненак. Быццам бы настолькі непрыхаваная блазнота, а закрадаецца сумненне: раптам ён усё гэта сур’ёзна? Але праўды нам не даведацца: Пукст сапраўды яе не адкрые, а звыкла накідае разумных, прэтэнцыёзных прапаноў, смешных і не вельмі, якія нібыта растлумачаць сэнс праекта “Георгій Дабро”. Ды хочацца часам паганяць музыканта, асабліва за бязлітасны кавер “Lithium” іконы гранджу.

(((O))), міні-альбом “We Hate You”

А.: Музыкант прызнаецца, што да напісання гэтага матэрыялу яго падштурхнула смерць блізкага чалавека. Та-

кое таксама бывае. У творчых людзей любога кшталту перажыванні трансфармуюцца ў мастацтва, якое мы потым слухаем, бачым, чытаем. Змрочны постапакаліптычны міні-альбом. Пад яго не будзеш “дэнсіць” у модным клубе з прыгожай дзяўчынай. І не станеш уключаць на ўсю моц гук у машыне, а потым катацца па двары. Гэтая музыка, хутчэй, асабістага характару, для праслухоўвання ў навушніках. Яна паглыбляе ў прыватны выдуманы свет — свет будучыні, які намалюе ўяўленне. Пагадзіцеся, цікава ж! Пры гэтым музыка не раздражняе і не напружвае слухача. Яна ў мяне вельмі асацыюецца з папулярнай у Расіі радыёперадачай “Мадэль для зборкі”: на мой погляд, было б цікава паслухаць які-небудзь фантастычны аповед у выкананні аўтара праграмы Улада Копа пад такую музыку.

В.: Не задавайцеся пытаннем: (((O))) — гэта псеўданім. Выканаўцу клічуць Мікіта Васільеў, і ён з Гомеля, дзе да нядаўняга часу было вельмі шмат “цяжкіх” гуртоў, а цяпер вось з’явіўся цікавы электроншчык, які стаў летась сенсацыяй адной з інтэрнэт-прэмій.

З кожнай наступнай працай творчасць артыста становіцца ўсё больш канцэптуальнай, падначаленай нейкай тэме, настрою і ўплыву дадзенага моманту. У гэтым рэлізе лёгкіх, празрыстых трэкаў, якія ў Мікіты выходзілі па-майстэрску, гуляючы (хай іх было і не шмат), няма. Сурова, халаднавата, змрочна-таямніча, не гэтак меладычна, эмацыйна ледзь перагружана. Клас — высокі, але яшчэ раз гэтыя дарожкі я, не з’яўляючыся аматарам падобнай музыкі, круціць не стаў бы.

ВІДЭА

Гурт “:B:N:”, кліп на песню “Попел”

А.: Дэбютная праца маладога рэжысёра Антона Мамоненкі, у якой, перакананы, ён раскрыў толькі трацін у сваіх магчымасцей. Згадваецца старая прымаўка пра лыжку да абеду. Так і тут: добры, шчыльны, змрочны кліп — тое, што трэба “:B:N:” менавіта цяпер. Дадзены ролік выгодна глядзіцца на фоне папярэдніх відэаработ гурта. Самой камандзе, якая ўжо мае пэўны

статус, зусім не абавязкова ў кліпах паказваць супермаркеты з паўагаленымі дзяўчатамі. Ці войскі зомбі і выратавальны атрад, на чале якога стаіць, трымаючы бензапілу, франтмэн калектыву Алесь Лютыч. Не варта і маладому слухачу ў гэтым відэа шукаць асаблівы сэнс. Проста добры кліп з цікавым попельным малюначкам. Застаецца павесіць сабе на сцяну ў сацыяльную сетку і лічыць лайкі.

В.: Гурт з Бярозы з’яўляецца адным з лідараў рэгіянальнага року. Магчыма, каб Бяроза была, прынамсі, бліжэй да Мінска, мела цэнтравыя для краіны пляцоўкі ды асноўныя фестывалі, “:B:N:” апынуліся б у ліку вядучых калектываў у сваім сегменце. У рэальнасці ж каманда зрэдку вылучаецца выступамі, якія абмяркоўваюць меламаны, і выдае нагара больш ці менш удалыя аўдыя- і відэатрэкі. Усё як ва ўсіх.

Дадзенае тварэнне да удач я не аднёс бы. Сама кампазіцыя яшчэ туды-сюды — энергічна-дэпрэсіўная, з якой-ніякой мелодыяй. Карцінку ж ёй спадарожную можа наваяць, як мне здаецца, любы, хто ведае, што такое кінакамера. Маладая пара, у якой на пачатку роліка ўсё добра, па невядомай прычыне сварыцца, таму ў фінале ўсё блага. Гледачам таксама перыядычна паказваюць гурт. Усё.

Гурт “Nuteki”, кліп на песню “Дні кіламетры”

А.: Я прывык бачыць ад “Nuteki” кліпы з кучай спецэфектаў, гэткія міні-блокбастары. Работа на трэк “Wind Inside” чаго вартая! Аднак тут гледача чакае “love story” пра двух маладых людзей і дэспата-маму дзяўчыны, якая не пускае юнака ў іх кватэру. Але герой не адчайваецца і дамаўляецца з гуртом “Nuteki”, каб яго музыканты прыцягнулі да пад’езда каханай апаратуру і пачалі граць песню, нягледзячы на мароз і шчыльны гра-

фік. Напрыканцы сэрца маці растаяла, і каханне перамагло. Добры кліп з хэпі-эндам, напэўна, прыйдзецца даспадобы шмат каму. Пра тое сведчыць колькасць яго праглядаў.

В.: І тут таксама сюжэт будуецца вакол адносін паміж дзяўчынай і юнаком! Акрамя ўздзеяння на маму прыгажуні праз песню гурта “Nuteki”, хлопча, маючы сувязі ў будаўнічай арганізацыі, падымаецца ў люльцы да адзінай і ненаглядНай проста на балкон. Мама ж, на якую сыходзіць азарэнне, назірае за хэпі-эндам. Цяжка нават выказаць здагадку, што здарылася б з ёй, праспявай у двары, напрыклад, Аляксандр Саладуха... Кліпаў у свеце з аналагічным дзействам — мора. А песня поп-рок-калектыва з паўгода дакладна пратрымаецца ў плэерах прыхільніц.

Магілёўскі АМЦНТіКАР праводзіць абласны **агляд-конкурс непрафесійных** харавых калектываў мастацкай творчасці.

Экспрэс-тур з V.I.P.-земляком: Баранавічы

Чаму ДК

З Баранавічамі ў мяне звязаны асабістыя ўспаміны. Калісьці даўно ў ім жыла самая прыгожая ў свеце дзяўчына, у якую я быў без адказу закаханы. Улюбёны я і ў музыку гурта "Крама". Яго лідар Ігар Варашкевіч і стаў першым удзельнікам новага праекту газеты. У яго рамках журналіст выдання запрашае вядомага чалавека, які адбыўся як асоба ў сталіцы ці іншым горадзе, выехаць у яго родныя мясціны. Навошта? Каб наведаць установы культуры, а разам з супрацоўнікамі тых "кропак" пазнаёміцца з меркаваннем старонняга назіральніка. У артыкулах вы не сустрэнеце спробы ўсеабдымнага аналізу. Гэта, хутчэй, падарожжы ў дзень учарашні праз партал сённяшняга дня.

Алег КЛІМАЎ, Мінск — Баранавічы — Мінск / Фота аўтара



Ігар Варашкевіч у Баранавіцкай ЦБ імя Валянціна Таўлая.

Ад музея да бібліятэкі: пра актуальнае ў культуры праз фармат шпацыру

"Медыя-аўтобус".

Я б у заолагі пайшоў...

Ігар Варашкевіч нарадзіўся ў 1960-м. Пражыў у Баранавічах (з перапынкам на вучобу ў мінскай ВНУ) амаль 30 гадоў. Па яго прызнанні, юнаком ён быў некалькі замкнёным: гурткі не наведваў, не асабліва цягнула і да публічных месцаў, хіба ў выпадках школьных паходаў. "Арганізаваны выхад у музей успрымаўся як "абавязалаўка", хаця не ўсе знемагалі ад нуды: камусьці з маіх аднакласнікаў было цікава, — заўважае Ігар. — Аднак, наколькі я ведаю, ніхто з іх у якасці прафесіі не абраў шлях краязнаўцы ці гісторыка". Але менавіта ў экскурсію па мясцовым Краязнаўчым музеі (між іншым, яго колішні дырэктар Валерый Палікарпаў і бацькі Ігара падтрымлівалі сяброўскія стасункі) мы з Варашкевічам і выправіліся.

А з музеем у артыста звязана цэлая "драма". У яго мелася кніга з шыкоўнымі ілюстрацыямі дыназаўраў. (Людзі нашага з Ігарам веку памятаюць, што ў СССР траплялі надрукаваныя за мяжой невялікімі накладамі дзівосныя тэматычныя альбомы з яркімі малюнкамі і на выдатнай паперы.) Яе ў Варашкевіча хтосьці з прыяцеляў "зайграў". Але ў выніку альбом нібыта апынуўся ў... фондзе музея. Зрэшты, сённяшнія супрацоўнікі ўстановы пра такую кнігу як пра экспанат нічога не чулі, і паданняў пра яе з гэтай нагоды не захавалася... Карацей, не выпадкова даўжэй за ўсё мы затрымаліся ў зале з жывёльным светам. "Са школьных прадметаў мне больш за іншыя падабалася заалогія, дома ставала кніг па гэтай тэме, — патлумачыў мэту прыпынку Ігар. — Я вось калекцыянаваў матылькоў, гербарый таксама збіраў. Праўда, скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут па спецыяльнасці "Інтэр'ер і абсталяванне"... Гэта сведчыць хіба пра тое, што мяне нельга разглядаць як жывапісца (хоць, вядома, маляваў нешта па матывах прыроды роднага краю): я графік, для сябе і для сяброў часам малюю коміксы".

Тыя з гасцей Баранавічаў, хто затрымліваецца ў горадзе надоўга, музей не абмінаюць. Але асноўны кантынгент наведвальнікаў — усё тыя ж школьнікі. Як нам распавялі наглядчыкі залаў, нярэдка трапляюцца сярод іх юнакі і дзяўчаты дапытлівыя, неабыякавыя да мінулага і сучаснасці радзімы, і тут яны атрымліваюць дадатковую інфармацыю аб ёй — візуальную. Ігар Варашкевіч пагаджаецца з тым, што ў часткі маладога пакалення існуе цяга да атрымання больш глыбокіх ведаў пра сваю краіну, і такая моладзь жыве з ёй у адным рытме падзей. Як прыклад Ігар прыгадаў нядаўняе свята роднай мовы ў Мінску, дзе і ён паўдзельнічаў. "Прыемна здзівіла колькасць людзей, прычым, не выпадковых, з запаленымі вачыма! На мой погляд, сёння Беларуссю, працэсамі, што адбываюцца ў розных сферах краіны, цікавяцца значна больш грамадзян, чым нават у першыя гады незалежнасці. Такой увагі я не памятаю ў землякоў і да Савецкай Беларусі ў 1970 — 1980-я".

— Не хачу сказаць, што маладых людзей, якія цікавяцца краязнаўствам, прыходзіць у музей вельмі шмат, але яны ёсць, — далучаецца да размовы галоўны захавальнік фондаў установы Рыта Чартко. — Ведаю, што хтосьці збірае паштоўкі з відамі Баранавічаў, нехта займаецца Першай сусветнай вайной і яе следам у гісторыі нашага горада. Ну а вочы малеч, калі яны вывучаюць пудзілы жывёл, трэба бачыць! Здавалася б, яны усялякіх звяроў наглядзеліся ў мультфільмах, па тэлевізары, але ўсё роўна ў гэтай зале дзятва вельмі актывізуецца.

Пагладзіць упадабаныя пудзілы звяркоў не атрымаецца (яны размешчаны за шклом), але без інтэрактыву ва ўстанове не абыходзяцца. У час музейна-педагагічных заняткаў дзеці могуць патрымаць у руках, напрыклад, крамянёвыя прылады працы старажытнага чалавека.

Пра свае ж уражанні наш спадарожнік-музыкант кажа: музей, безумоўна, наведваць трэба. "Адна справа нешта даведацца пра родны край з літаратуры, з Інтэрнэту, што таксама выдатна. Але тут зусім іншае — літаральна судакрануцца з мінулым. Асабліва, калі чалавек па сваёй натуры дамасед. Гэта як дыск і жывы канцэрт: слухач поўнае ўражанне пра выканаўцу атрымлівае менавіта на яго выступленні".

Перш за ўсё — кіно!

У кінатэатры "Кастрычнік" памяшканне вялікай залы здадзена начному клубу, а ў фае ідзе ганню". І быў проста агаломшаны! Або "Золата Маккены". Наогул, кінатэатр — гэта нешта асаблівае ў мой час. З чэргамі на касавыя карціны кшталту "Няўлоўных мсціўцаў", "Фантамаса" ці "Пана Валадыеўскага". Меркавалі заўжды, шырокаэкранны будзе фільм або шырокафарматны? Ну а калі перад асноўнай стужкай паказвалі кіначасопіс "Фитиль" альбо мультфільмы, то паход у кіно лічыўся надзвычай удалым. Праўда, настрой злёгку псаваўся ад кінахронікі пра які-небудзь з'езд КПСС".

Дзялюся з Ігарам сваім "духам" кінатэатра: буфет з ліманадам і бутэрбродамі, адчуванне судатыкнення з чымсьці важным, калі аншлагу не было, стараліся сесці так, каб побач крэслы пустаўалі, нарэшце, пацалункі на заднім шэрагу з дзяўчынай...

даль мёдам, кветкамі і чымсьці яшчэ. А таму гутарыць пра дзень цяперашні мы, у суправаджэнні метадыста Наталлі Буйноўскай, перайшлі ў залу малую.

— У перспектыве спадзяёмся на глабальны рамонт, — дзеліцца яна, — але ўжо цяпер абнавілі дзверы, фасад, замянілі крэслы, на падлогу паклалі дывановае пакрыццё, усталявалі лічбавае абсталяванне. Хочам вярнуць на фасадзе вывеску "Кінатэатр "Кастрычнік", а пакуль абыходзімся бягучым радком.

Я канстатую, што выглядае малая зала вельмі прыстойна. Але Наталля Буйноўская заўважае:

— Нам цяжка "спаборнічаць" па камфорце і паслугах з прыватным кінатэатрам "Зорка", які размешчаны ў Доме афіцэраў. Тое пакаленне моладзі, што ходзіць цяпер у кіно, вырасла там, у нас жа публіка іншая, няхай працэнт школьнікаў сярод яе і высокі. І, нягледзячы на тое, што з наведвальнасцю маюцца праблемы, я асабіста стараюся з аптымізмам глядзець на нашу будучыню: кінаманаў хопіць на ўсіх.

А Ігар Варашкевіч памятае часы, калі канкурэнтаў у "Кастрычніка" не існавала. "Я сам быў кінаман! Напэўна, многае з таго самага лепшага, што згадваю з дзяцінства і юнацтва, звязана з кіно і, у прыватнасці, з "Кастрычнікам". Годзе ў 1972-м з бацькамі глядзеў на апошнім сеансе навукова-папулярны дакументальны фільм "Успаміны пра будучы-

— Ну не! — ускліквае музыкант. — Я канкрэтна прыходзіў глядзець кіно!..

Мама Ігара, якую ён сістэматычна наведвае, жыве ўсё ў тым жа доме, дзе калісьці жыў і ён, — насупраць "Кастрычніка". А напрыканцы 1970-х, седзячы на балконе, Варашкевіч назіраў, як зносілі стары будынак кінатэатра: у перапрафіляванага танка з металічным трохкутным "франтонам" ніяк не атрымлівалася разбурыць гмах. "Сляза прабіла", — прызнаецца музыкант. Але і было чаканне, што ж прыйдзе на змену? А пасля ўзвядзення новага будынка пра стары кінатэатр хутка забыліся...

А вы кажаце "савок"...

Пра Гарадскі дом культуры абмяжуемся каментарамі нашага спадарожніка. На жаль, так атрымалася, што ніхто з работнікаў установы пра цяперашняе яго быццё нам не распавёў...

— Успаміны звязаны ў асноўным з канцэртамі, на якія я хадзіў. Напрыклад, польскага гурта "Братэрства Куркове". Дарэчы, адзінае маё выступленне ў Баранавічах адбылося ў гэтым самым ДК ў 1980-я ў складзе гурта "Бонда": "Крама" ў Баранавічах ні разу не "засведчылася". (Затое 28 сакавіка знакамітая каманда дасць чарговы вялікі канцэрт у Мінску. — **А.К.**) Мясцовыя музыканты, якія гралі танцы ў Доме культуры, былі дастаткова высокага ўзроўню, на

ф о т а ф а к т

Старадаўняе і сучаснае

Заўтра ў Канцэртнай зале Сафійскага сабора распачынаецца XXVIII Міжнародны фестываль старадаўняй і сучаснай камернай музыкі. На адкрыцці форуму пад кіраўніцтвам нямецкага дырыжора Крыстафа Хаўзера выступяць камерны хор "Notabene" і камерны аркестр "Еўропа-цэнтр".

На здымках, прадастаўленых адміністрацыяй фестывалю, — моманты папярэдніх святаў у Сафійскім саборы.

Сітуацыя

ДТЗ і РМЦ

У ноч на 14 сакавіка ў будынак Ганцавіцкага раённага метадычнага цэнтра на вялікай хуткасці трапіў легкавы аўтамабіль. У выніку дарожна-транспартнага здарэння ўстанове быў нанесены вялікі ўрон.

Кастусь АНТАНОВІЧ

Як адзначыла ў размове з карэспандэнтам "К" дырэктар Ганцавіцкага РМЦ Ала Занька, у выніку ДТЗ была моцна пашкоджана адна са сцен будынка, дах, вокны, а таксама асноўны камп'ютар. Зараз спецыяльна створаная камісія падлічвае ўсе выдаткі, а таксама мэтазгоднасць рамонту будынка. Асабліва крыўдна Але Святаславаўне ад таго, што ў кастрычніку мінулага года ў будынку быў праведзены рамонт і ўсталяваны новыя шклопакеты. Сёлета планавалася ўцяпліць памяшканне і абкласці яго сайдынгам, а таксама адрамантаваць падлогу. Зразумела, планы гэтыя адкладваюцца на невядомы тэрмін, бо пакуль не адбылося пасяджэння суда і афіцыйна не вызначаны вінаватыя ў здарэнні, работы па аднаўленні будынка праводзіць не плануецца.

Нягледзячы на гэта, па словах дырэктара ўстановы, праца супрацоўнікаў РМЦ не спыняецца. Часова ўстанова пераехала ў будынак Гарадскога дома культуры, дзе для яе быў выдзелены асобны пакой. Тэхніка і матэрыялы пакуль захоўваюцца ў непашкоджаных пакоях будынка РМЦ.

К

усё ж патрэбныя

апаратуру скардзіцца таксама не выпадала — усё гучала добра. І я прыходзіў некалькі разоў на тыдзень — слухаў, падглядваў, можна сказаць. Пасля браў прыватныя ўрокі ігры на класічнай гітары, а праз гады два ўжо і самастойна займаўся тым інструментам. Але губную гармоніку асвоіў хутчэй... Напэўна, ГДК карыстаўся папулярнасцю ў гараджан, бо ў Савецкім Саюзе — пры ўсёй разнастайнасці аб'ектаў культуры — не так шмат існавала ўстаноў, дзе можна было б цікава правесці вольны час. Я кажу менавіта пра культурна-забаўляльныя кропкі. Ну а што да клубаў па інтарэсах, то тут дзеці заўжды развівалі таленты або адкрывалі іх у сабе...

Размаўляючы, шпацыруем з артыстам па холе, падымаемся паверхам вышэй — амаль пуста.

■ "Пазітыву хапала. Асабліва ад зносін з людзьмі, якія працуюць у не самай грашовай сферы. Я далёка не прыхільнік збітых лозунгаў, што "дзеля ідэі мы гатовыя горы звярнуць", але многае варта рабіць ужо нават дзеля радзімы, яе гісторыі, культуры, мовы. **І вось гэтыя людзі, з якімі мы сёння сустрэліся, і аддаюць свае сілы, веды, жыццё іншым.** На іх і трымаецца лепшае, што ёсць у культуры нашай краіны".

Як і ў іншых аналагічных установах, жыццё тут абуджаецца пасля абеду, калі ў школах заканчаюцца ўрокі.

— Гляджу на Дом культуры — і як быццам нічога ў ім кардынальна не змянілася — ні звонку, ні ўнутры, — дзеліцца думкамі Ігар. — А рамонт патрабуецца, вядома. Але вось пытанне: ці патрэбныя сёння такія ўстановы?.. Паглядзіш, як дзеткі чарговы раз каго-небудзь збілі, зняўшы гэты працэс на мабільны і выклаўшы запіс у Інтэрнэт, пачынаеш добрым словам прыгадваць "савок", калі падлеткі вольны час праводзілі ў дамах культуры, дамах піянераў, спартыўных секцыях. Іншая справа, што тыя падыходы, спосабы выхавання і навучання, самі мерапрыемствы ў сваёй масе не надта адрозніваліся і ад сённяшніх узораў. Хаця часу мінула багата. Урэшце, пэўную базу той, хто займаецца, дапусцім, народнымі танцамі, спевамі, безумоўна, атрымлівае. Таму выснова мая зразумелая: ДК неабходныя.

Міф пра бібліятэкі і сакрэт артыста

У дзяцінстве будучая легенда беларускага року і блюзу марыла не толькі аб прафесіі заолага, але і... бібліятэкара. Таму фінальным акордам у нашых шпацырах па Баранавічах культурных мы абралі Цэнтральную гарадскую бібліятэку імя Валянціна Таўлая. Яе дырэктар — Вольга Аляксеенка, што называецца, здавала справы. Сваё рашэнне звольніцца яна патлумачыла тым, што ў яе жыцці наступіў такі момант, калі трэба ўсё як след абдумаць ды вырашыць, чым займацца далей.

Сам жа Ігар не лічыў сябе начытаным дзіцем. Зрэшты, жанравыя прыхільнасці ў яго былі. Школьная праграма — гэта адно, але вабілі больш прыгоды і фантастыка. Прытым, што бібліятэку ён наведваў рэдка: абыходзіўся хатнім кнігазборам. Але, крыху саромеючыся, Варашкевіч прызнаецца: у кніжніцу часам прыходзіў, каб... павыразаць з часопісаў карцінкі з машынкамі...

Тым часам я пачынаю ўголас разважаць, маўляў, бібліятэка, як і кіно, для савецкіх грамадзян з'яўлялася "парталам" у іншы свет. Сёння ж можна лёгка купіць любую кнігу ці прачытаць, спампаваць патрэбнае ў Інтэрнэце. А, значыць...

— Гэта міф, што ў бібліятэкі не ходзяць! — перапыняе мяне Вольга Аляксеенка. — Яны ўсё гэтак жа патрэбныя. Так, цяпер чытача прыцягнуць у бібліятэку больш складана, таму ў чытальнай зале не столькі людзей, як нават пяць гадоў таму. Але, паверце мне, сярод нашых наведвальнікаў паранейшаму шмат пенсіянераў, дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту. Бываюць дні, калі колькасць наведвальнікаў дасягае трохсот чалавек! Вядома, ёсць альтэрнатыва — Інтэрнэт, але і ён не ўсемагутны. У мяне двое дзяцей-школьнікаў, і аднойчы аднаму з іх спатрэбілася прачытаць кнігу ў рамках пазакласнага чытання. У Сеціве мы яе знайсці не змаглі, а ў нашай бібліятэцы ў папяровым выглядзе яна мелася.

Дырэктар ЦГБ наведала некалькі замежных бібліятэк, і яны поўныя народу. Прычым чытаюць там не толькі электронную літаратуру, але і звычайную. І яе, папяровую, працягваюць выпускаць. "Няўжо вы думаеце, што пры ўсім замежным прагматызме, там не пазачынялі б бібліятэкі, каб не было ў іх менавіта духоўнай мэтазгоднасці?! — зазначае спадарыня Аляксеенка. — Але ж не зачыняюць! Я наогул не веру, што надыдзе час, калі бібліятэкі ў нас знікнуць. Мяркую, дзве галіны ў беларускай культуры ў абавязковым парадку заслугоўваюць бюджэтнага фінансавання — музейная і бібліятэчная. Ёсць яшчэ і маральна-юрыдычны аспект, калі бібліятэка не парушае аўтарскае права, а карыстальнікі Інтэрнэту, як правіла, — так. Гэта тэма для гаворкі, напэўна, на дзяржаўным узроўні..."

ЦГБ піярыць свае паслугі (а тут і фітнэс для маладых мам, і курсы вязання, і курсы замежных моў — пра інавацыйныя пошукі ўстановы "К" пісала ў № 41 за 2014 год). Сярод эксклюзіўных праектаў — "Дзіцячая пляцоўка", "Медыя-аўтобус". Апошні — варыяцыя на тэму бібліятэкі на колах, арганізаваная Пасольствам ФРГ і Інстытутам Гётэ. Двойчы ў месяц аўтобус курсіруе па вуліцах горада і робіць два прыпынкі, падчас якіх ахвотныя могуць узяць папяровую літаратуру, аўдыя- і відэаматэрыялы, якія распавядаюць пра Германію. Вядома, хацелася б, каб з цягам часу па вуліцах райцэнтраў вандраваў такі ж аўтобус, што распавядаў бы — цікава і нешаблонна — пра Беларусь...

Лепшае ў культуры

Ваяж падышоў да канца. Вынікі яго падводзіць Ігар Варашкевіч:

— У час экспрэс-тура былі нейкія моманты, якія ўва мне выклікалі пачуццё засмучэння, але і пазітыву хапала. Асабліва ад зносін з людзьмі, якія працуюць у не самай грашовай сферы. Я далёка не прыхільнік збітых лозунгаў, што "дзеля ідэі мы гатовыя горы звярнуць", але многае варта рабіць ужо нават дзеля радзімы, яе гісторыі, культуры, мовы. І вось гэтыя людзі, з якімі мы сёння сустрэліся, і аддаюць свае сілы, веды, жыццё іншым. І нічога не просяць наўзамен, таму што, так атрымліваецца, няма чаго прасіць. На іх і трымаецца лепшае, што ёсць у культуры нашай краіны.

Што да канкрэтыкі... Музей, вядома, далёка не самы сучасны па візуальным рашэнні экспазіцыі, але, з іншага боку, я не спецыяліст, таму мне цяжка нешта прадметна прапанаваць, як менавіта мае выглядаць цяпер падобная ўстанова. У кінатэатры збянтэжыў кірмаш у фае, але я разумею, што час цяпер такі, калі ўстановам культуры даводзіцца знаходзіць спосабы для свайго існавання. А бібліятэка пакінула выдатнае ўражанне!

■■■

Магчыма, чытачы заўважылі, што часта мае "напарнікі" па ранейшых праектах адзначалі менавіта работнікаў культуры, якія ганарыліся сваёй працай і, разам з тым, не прыхоўвалі праблем. Часцяком — відавочных. І самі спадарожнікі аказваліся людзьмі розных прафесій ды поглядаў, выступалі ў ролях і "хваліцеляў", і крытыкаў. Так атрымалася і ў вандроўцы з Ігарам Вашкевічам. Менавіта такая разнастайнасць ацэнак дазваляла скласці з некалькіх суб'ектыўных дастаткова цэласную карціну меркаванняў адносна стану сучаснай рэгіянальнай культуры. Мне падаецца патрэбным з гэтай нагоды прывесці напрыканцы артыкула вытрымку з Паслання Прэзідэнта нашай краіны Аляксандра Лукашэнкі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу ад 22 красавіка 2014 года: "Нам патрэбна жывая краіна з разнастайнасцю ідэй і меркаванняў, з актыўнай пазіцыяй усіх яе грамадзян".

Фота аўтара К

■ Рэпліка паводле ўскоснай тэмы

Адна з тэм, узнятых пад час экспрэс-тура па ўстановах культуры з Ігарам Варашкевічам (уласна, тэма тая не тычылася толькі Баранавічаў), закранула ролю ДК у сучасным жыцці, у выхаванні моладзі: "Паглядзіш, як дзеткі чарговы раз каго-небудзь збілі, зняўшы гэты працэс на мабільны і выклаўшы запіс у Інтэрнэт, пачынаеш добрым словам прыгадваць "савок", калі падлеткі вольны час праводзілі ў дамах культуры, дамах піянераў, спартыўных секцыях", — зазначыў мой візаві.
Калі нумар рыхтаваўся да друку, іншы аспект дадзенай тэмы ўзняў на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы тэле- і радыёвядучы Канстанцін КАВЕРЫН. Вось яго рэпліка.

"Я, сябры, вось што скажу вам. Мы ў вялікай-вялікай... праблеме! Растлумачу.

Апроч іншага, я маю задавальненне працаваць на тэлеканале "Беларусь-2" у праграме, дзе мы паказваем розныя смешныя ролікі з Інтэрнэту. А напрыканцы праграмы я прашу людзей дасылаць смешнае відэа з уласных архіваў на пэўны адрас.

Дык вось, мне часта дасылаюць ролікі дзеці, падлеткі. Карацей, "кантынгенту" — 14 — 20 гадоў. У 70% выпадкаў смешнымі ім здаюцца моманты, калі адзін б'е нагамі іншага, калі дзяўчынка спіць на падлозе ва ўласных ванітах, калі 15-гадовы пацан "глушыць" гарэлку, што называецца з рыльца, калі хлопец б'е аднакласніцу... Карацей, дзецям здаецца смешным гэты жудасны сэлфмэйд-натуралізм.

Чаго ўжо там, я таксама любіў з сябрамі якое-небудзь глупства зняць на мабільнік і ржаць над гэтым потым. Але выключна ў сваёй кампаніі, дзе два — тры чалавекі. А то і адзін. Мне ніколі не прыйшло б у галаву адправіць падобнае каму-небудзь і тым больш паспадзявацца, што гэта можна паказаць па тэлебачанні.

Мне вельмі сумна. І я не ведаю, што з усім гэтым рабіць".

Дык якая роля ў такой сітуацыі можа быць ва ўстановы культуры? Прапануем абмеркаваць тэму на старонках газеты! **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby**

На людным месцы

Маладзёжны агіт-марафон

Будні бярэзінскіх бібліятэкараў насычаны не адно кнігавыдачамі, але і "калякніжнымі" справамі. У першай дэкадзе сакавіка Бярэзінская раённая бібліятэка ініцыявала правядзенне на Бярэзіншчыне Тыдня прафілактыкі ўжывання спайсаў "Стоп, спайс!".

Пад час мерапрыемства.

БЕРАЗІНО

Мерапрыемства засведчыла высокі рэйтынг запатрабаванасці і пераросло ў акцыю, якая ахапіла 6 школ горада і раёна ў рамках 10 выступленняў як на базе бібліятэкі, так і на і выездзе.

Маладзёжная аўдыторыя востра ўспрымае праўду жыцця, увасобленую ў мастацкай форме. Зацікавіць маладых — значыць, дасягнуць увагі, знайсці неардынарныя падыходы — запомніцца, зрабіць успрыманне інфармацыі вобразна-эмацыянальным. У ходзе акцыі бярэзінскай моладзі былі прапанаваны агіт-марафоны. Навучэнцы гімназіі і школ класамі наведвалі актавую залу ЦБ, стылізаваную для мерапрыемства. Выязныя агіт-туры ў Пагосцкую, Любушанскую і Гарэніцкую сельскія школы бібліятэкары зладзілі разам з супрацоўнікамі аўтаклуба РДК. У так званай Чыстай кнізе пад калектыўнай заявай "Мы — за чысты ўзрост без бруду наркотыкаў" сабрана звыш за 300 подпісаў юнакоў і дзяўчат. Тэатралізаваныя споведзі ахвяр спайсаў, актуалізаваныя пераклады тэкстаў вядомых песень, мудрыя прыпавесці, шок-факты і гісторыі трагедый маладых лёсаў, заканадаўчыя пастулаты Дэкрэта Прэзідэнта Беларусі ад 1 студзеня гэтага года — усё працавала на агітацыю задуманага бібліятэкай руху.

У лютым бібліятэкары ўжо прапанавалі бярэзінскай моладзі агіт-туры "Не абдымай, каго прыйдзецца". Наперадзе — аналагічныя акцыі па прафілактыцы падлеткавага брыдкаслоўя "Наша ўмова — далоў брыдкае слова" ды ўжывання піва "Піва — не вадзіца, з хмяльным сябрам не трэба вадзіцца!"

Тамара КРУТАЛЕВІЧ, загадчык аддзела маркетынгу Бярэзінскай цэнтральнай бібліятэкі

Выстаўка **кітайскага мастака Лян Юнхэ** адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.

Тактыка культурнага развіцця

Узяць у палон... абітурыента

Уважлівы чытач, напэўна, памятае нашы публікацыі пра адмысловыя творчыя праекты, што нараджаюцца апошнім часам у сценах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Карысным падаецца тое, што праектнай дзейнасцю займаюцца самі студэнты. Што называецца, тэорыю пераўтвараюць ў практыку. Нават назву для агульных творчых намаганняў прыдумалі адмысловую: "Канструктар". БДУКіМ працягвае канструяваць крэатыў і сёлета. Яскравы таму доказ — Дзень адкрытых дзвярэй універсітэта, што прайшоў 16 сакавіка.

Яўген РАГІН

PR-ход, абраны кіраўніцтвам установы, варта, на мой погляд, у маркетынгавыя падручнікі заносіць. Акцыя па "заманьванні" абітурыентаў прайшла на "чужой" тэрыторыі — у Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры. Доказ таго, што навучальная ўстанова няўхільна павялічвае сферу ўплыву, у тым ліку — і сталічную. А яшчэ — пацвярджэнне факту пра павышаны попыт на выпускнікоў БДУКіМ. У дадзеным выпадку ўніверсітэцкія выхаванцы і вучацца, і практычнай творчасцю займаюцца: ад першакурсніка да пяцікурсніка бяруць удзел у мюзікле "Дуброўскі". Паказ сумеснага расійска-беларускага праекта быў праведзены для ўсіх ахвотных пасля сустрэчы абітурыентаў з рэктарам БДУКіМ, дэканамі факультэтаў, загадчыкамі кафедр, вядучымі выкладчыкамі ў галіне культуралогіі, інфармацыйна-дакументных камунікацый, менеджмента, музычнага мастацтва, эстрады, харэаграфіі. Такім чынам, сумнаваты, па словах рэктара Юрыя Бондара, прафарыентацыйны дзень быў расфарбаваны выдумкай і магчымасцю студэнцкай самарэалізацыі.

"Спектральны" аналіз "Дуброўскага" ў мае прафесійныя абавязкі не ўваходзіць. Таму чытацкую ўвагу спыню на першай частцы мерапрыемства. Рэктар пад час прэс-канферэнцыі адразу расставіў прыярытэты ўстановы: нацыянальная традыцыя поруч з абавязковымі інавацыямі стварае ўмовы для задавальнення любых творчых амбіцый. А ў выніку — самая доўгатэрміновая перспектыва для паступальнага руху. У тым, што яна з'яўляецца практыкаарыентаванай, пераконвае такі факт: сёлета ўстанова пачне рыхтаваць гукарэжысёраў, рэжысёраў радыё і тэлебачання, дызайнераў сцэнічнага касцюма… Новыя спецыяльнасці ўзніклі пад уплывам працы над "Дуброўскім". Той выпадак, калі практыка падштурхоўвае да выпраўлення хібаў тэорыі.

Самая адважная абітурыентка задала Юрыю Бондару, бадай, самае важнае (у тым ліку — і для мяне) пытанне: "Якія базы для праходжання творчай практыкі прапаноўвае ўніверсітэт?" Для адказу быў узяты прыклад факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва. Дык вось, існуе для гэтага 28 базавых арганізацый. Сярод іх — вядучыя ўстановы культуры Мінска. Будучыя харэографы практыкуюцца ў Беларускім дзяржаўным заслужаным харэаграфічным ансамблі "Харошкі". Рэжысёры праходзяць практыку ў Белдзяржфілармоніі, "Мінскканцэрце"… Карацей, пытанне "Чаму гэтых спецыялістаў на раёнах днём з агнём не адшукаеш?" адпадае само па сабе. Чуў калісьці ад дзяўчыны з харэаграфічнай адукацыяй, што яна выдатніцай у БДУКіМ стала толькі з той прычыны, што хацела не на сяле працаваць, а замежжа пабачыць. Цяпер з гастроляў не вылазіць...

Даўно заўважыў: чым больш прэстыжу ў БДУКіМ, тым менш выпускнікі затрымліваюцца ў вёсцы. Няўжо, каб змяніць сітуацыю, трэба менш перспектыў перад студэнтамі адкрываць? Ды не, не мадэль навучання варта мяняць, а стан вясковага развіцця.

К

Каледж канцэртаў

Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж імя Рыгора Шырмы днямі справіць сваё 75-годдзе. Размову пра гэтую навучальную ўстанову мы вядзем з дырэктарам Рамуальдам ЖАБІНСКІМ — не толькі знаным баяністам, але і аўтарам аб'ёмнай, надзвычай змястоўнай манаграфіі "Брэсцкі музычны каледж: гісторыя і сучаснасць", што пабачыла свет некалькі гадоў таму.

Надзея БУНЦЭВІЧ

— Рамуальд Адольфавіч, за дзесяцігоддзі ў каледжы склаліся цікавыя традыцыі, якія вы падтрымліваеце і дагэтуль.

— Адна з іх, і найбольш трывалая, — гэта як мага больш шырокая канцэртная дзейнасць. На сёння мы бадай адзіная навучальная ўстанова, дзе захавалася такая форма, як Тыдзень музыкі для дзяцей і юнацтва. Падобныя Тыдні, што ўзніклі ў савецкія часы і былі прымеркаваны да вясновых канікул, з цягам часу амаль паўсюль зніклі. А мы іх не толькі падтрымліваем, але і надаём ім усё больш шырокі разгорт. Па сутнасці, гэта сапраўдны музычны фестываль, адрасаваны моладзі. Невыпадкова і юбілейны гала-канцэрт пройдзе акурат у час чарговага такога Тыдня. Зірніце на афішу: гэта не выступленні "дзеля птушачкі", а паўнавартасныя канцэртныя праграмы, скіраваныя на нязмушанае выхаванне і асветніцтва маладога пакалення. Кошт білетаў — 30 тысяч рублёў — даступны кожнаму. Пастаянна ўдзельнічаюць нашы калектывы, выкладчыкі і навучэнцы і ў Міжнародным фестывалі "Студзеньскія музычныя вечары". Дарэчы, пачынаўся гэты форум калісьці менавіта на нашай сцэне і толькі потым "пераехаў" на пляцоўку абласнога драмтэатра. Старшыня Брэсцкага філіяла Беларускага саюза музычных дзеячаў Лідзія Батырава, якая ладзіць "... Вечары", — нястомны "вечны рухавік", і мы можам толькі ганарыцца, што ў горадзе ёсць такі фестываль, які з'яўляецца адметнай рысай усяго рэгіёна.

— А чаму тады панізіўся статус вашага фестывалю-конкурсу "Пралескі"? Калісьці ён лічыўся міжнародным, цяпер стаў Адкрытым абласным. Звычайна ўсе імкнуцца зрабіць наадварот — любымі сродкамі дамагчыся назвы міжнароднага.

— Хацелася, каб на ім як мага больш шырока была прадстаўлена Брэстчына. На міжнародных конкурсах заўсёды ёсць "пастаянныя" ўдзельнікі, якія з адным і тым жа добра абыграным рэпертуарам едуць "здымаць вяршкі". Мы ж імкнёмся развіваць узровень музычнай падрыхтоўкі рэгіёна. І ганарымся тым, што сёння праводзім абласныя конкурсы і фестывалі па ўсіх спецыяльнасцях — у тым ліку, і з мэтай прафарыентацыі. Дзеля гэтага ж рэгулярна ладзім метадычныя чытанні, аказваем разнастайную іншую дапамогу, праводзім кансультацыі.

— А не перашкаджае набіраць абітурыентаў тая акалічнасць, што ў вашага каледжа, у адрозненне ад многіх іншых такіх устаноў па рэспубліцы, няма свайго інтэрната?

— Вельмі хацелася б, каб юбілейныя ўшанаванні сталі своеасаблівым штуршком да канчатковага вырашэння гэтай праблемы. На дзяржаўным узроўні ўсе неабходныя рашэнні прыняты, зямля пад будаўніцтва вылучана, дакументацыя цалкам падрыхтавана. Засталося толькі атрымаць грошы, абвясціць тэндар і знайсці падрадчыка. Спадзяюся, гэта будзе жытло не толькі для навучэнцаў нашага каледжа, але і для работнікаў усёй сферы культуры. Бо пакуль даводзіцца дамаўляцца з іншымі ўстановамі і рассяляць моладзь па чужых інтэрнатах.

— А між тым, нягледзячы на адсутнасць належных побытавых умоў, культурнае жыццё ў каледжы віруе. На сцэне навучальнай установы праходзіць не адзін згаданы вамі Тыдзень музыкі для дзяцей, а пастаянныя выступленні, што складаюцца ў цыклы.

— Так, "Музыка нашых дзён" прысвечана беларускім кампазітарам. Некаторыя з іх (тая ж Галіна Гарэлава) прыязджалі да нас на свае вечары, зладжаныя каледжам. Ёсць у нас і фэст "Фарбы аркестравага гучання", і конкурс дырыжораў, які праходзіць у некалькі тураў: і пад раяль, і ўласна з аркестрамі, бо ў нас іх некалькі — сімфанічны, духавы, народны, цымбальны. І ўсе актыўна канцэртуюць! Гэтак жа, як і шматлікія харавыя калектывы, дзе ўдзельнічаюць не толькі будучыя спевакі і дырыжоры. Ёсць нават хор тэарэтыкаў! Чулі б вы, як яны спяваюць, да прыкладу, патрыятычныя песні. Такая практычная скіраванасць, адчуванне сваёй запатрабаванасці становяцца дадатковым стымулам да навучання. Тая ж музыказнаўца Валянціна Мальцава арганізавала і правяла цікавы цыкл "Эвалюцыя жанра фартэпіяннага канцэрта", пачынаючы ад эпохі барока. Іграў сімфанічны аркестр каледжа, а саліравалі самыя вядомыя беларускія піяністы: народны артыст краіны Ігар Алоўнікаў, лаўрэаты міжнародных конкурсаў Юрый Бліноў, Кацярына Марэцкая. І гэта не адзінкавы прыклад! Так што можна сказаць ганарліва: маўляў, творчасць перамагае побытавыя праблемы. Але ўсе мы марым, каб апошнія папросту зніклі.

К

Рамуальд ЖАБІНСКІ.

Музычная дзейнасць праз нелакальную танальнасць

■ Кажа эксперт

Рыгор БЫСЮК, дырэктар Мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой":

— Дзейнасць музычнага каледжа імя Рыгора Шырмы я ведаю цягам многіх гадоў, яшчэ па сваёй ранейшай пасадзе начальніка ўпраўлення культуры Брэскага аблвыканкама. Магу даць гэтай навучальнай (а "па сумяшчальніцтве" яшчэ і канцэртнай) установе толькі самую высокую адзнаку. Калектыў сапраўдных прафесіяналаў! Умеюць працаваць з падлеткамі, знаходзяць да кожнага свой падыход. А якія канцэрты ладзяць! Узгадаю хаця б тыя праграмы, што рыхтаваліся для музейнага комплексу. Няма чаго і казаць, што салісты і калектывы каледжа выступалі ў нас неаднойчы. Летась да Дня Перамогі правялі канцэрт-марафон — з 11-й раніцы да паловы чацвёртай дня. Праграма была складзена так, каб публіка магла далучыцца да яе ў любы момант — і так жа ў любы момант сысці, як гэта ўласціва вулічным выступленням. Але былі і тыя, хто не сыходзіў, застаючыся да канца, настолькі іх захапіла і прафесійнае майстэрства, і сама апантанасць музыкантаў. Вядома, да ўгодкаў пачатку Вялікай Айчыннай мы запрасілі каледж зноў, на гэты раз з начным канцэртам. Ізноў неверагодны поспех! Выступаюць яны і на прадпрыемствах, і перад дзецьмі. Ужо адной толькі сваёй канцэртнай дзейнасцю каледж заняў годнае месца ў нашай культуры. А яны ж яшчэ і кадры рыхтуюць — ды якія!..

■ Хэдлайн рэгіёна

Геаграфічны ўхіл

Геаграфія куды больш шчыльна звязана з развіццём культуры і мастацтва, чым пра тое прынята думаць. Пачынаўся іх тандэм здавён, калі і слоў такіх не ведалі. Звярніце ўвагу, усе народныя абрады, фальклорныя традыцыі, строі, інструментарый залежаць найперш ад прыродных умоў: надвор'я, ландшафта, распаўсюджанасці пэўных жывёл ды раслін.

Продкі ўмелі выкарыстоўваць усе свае геаграфічныя асаблівасці, знаходзячы ў іх перадумовы для пэўнага мастацтва. А мы? Ці ўмеем рабіць гэтак жа? Ці разумеем, што "ў прыроды няма дрэннага надвор'я"? Бо гэта значыць — трэба кожны "мінус" ператварыць у "плюс". У Брэсце так і робяць. Здавён. Так і склалі свае традыцыі — не толькі "блізкасці да Захаду" (чытай: Еўропы), але і "скрыжавання ўсіх шляхоў". Менавіта на сцэне музычнага вучылішча, як называўся калісьці каледж, выступалі еўрапейскія і расійскія зоркі. І гэта таксама паспрыяла той музычнай аўры, што пануе ў навучальнай установе. Узяты курс — дацягнуцца да зорак — вытрымліваецца цягам доўгіх гадоў. І набывае сёння асаблівае значэнне. Навучэнцы каледжа ўдзельнічаюць не толькі ў шматлікіх дабрачынных мерапрыемствах, але і, нароўні, у фестывалях міжнароднага разгорту, што праходзяць у Брэсце. Яны могуць бачыць і чуць прыклады высокага музычнага (а таксама і тэатральнага) майстэрства. І гэта не толькі не вымушае іх "апускаць рукі", а наадварот дысцыплінуе, настройвае на ўласныя дасягненні. Асабіста ведаючы некаторых выкладчыкаў каледжа, і не першы год, з усёй адказнасцю засведчу: многім іх напрацоўкам магла б пазайздросціць сталічная прафесура. Бо ў каледжы пульсуе дух вынаходніцтва, творчай апантанасці.

ф о т а ф а к т

Інтэрпрэтацыі ў галерэі

У гомельскай Карціннай галерэі Гаўрылы Вашчанкі працуе чарговы этап мастацкага праекта "Дыялог эпох. Інтэрпрэтацыі", што заключае ў сябе спробу пераасэнсавання сюжэтаў заходнееўрапейскіх майстроў XVI — XX стагоддзяў беларускімі творцамі. Прычым пасля першай выстаўкі праекта ў сталічнай Гарадской мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва спіс яго ўдзельнікаў пашырыўся. / **Фота Дзіны ПАНАЁЦІС**

Сёння студэнты і выпускнікі Акадэміі музыкі выканаюць **арганныя творы** І.С. Баха ў касцёле Найсвяцейшай Троіцы на Залатой Горцы.

"Пенсія" для мастака

Гутарка пра стварэнне ў Мінску вялікага Цэнтра сучаснага мастацтва вядзецца з такой зайздроснай рэгулярнасцю, што сама думка некалі абавязкова павінна ўрэчаісніцца. Іншая справа — якім павінен быць гэты цэнтр? Натуральна, пытанне мае вельмі шмат адказаў, пра што сведчаць хаця б тыя разнастайныя ўстановы, якія паўсталі ў краінах "постсавецкага лагеру". Думаецца, вельмі важна прааналізаваць іх досвед, каб цягам дыскусій выбраць той варыянт, які асабліва пасуе менавіта для нашай культурнай прасторы. Серыю матэрыялаў пра цэнтры сучаснага мастацтва з іншых краін мы вырашылі распачаць з найстарэйшай і ці не самай паважнай такой установы — "Замка Уяздоўскага" ў Варшаве.

Ілья СВІРЫН

Адзін з прыкладаў афармлення прасторы ў Замку Уяздоўскім, што, пагадзіцеся, кантрастуе з экстэр'ерам палаца.

Вымярэнні цэнтраў сучаснага мастацтва: прыстасаваць каралеўскі замак

ПОЛЬШЧА

Агульная інфармацыя

Налета Замак Уяздоўскі адсвяткуе 30-годдзе. Як няцяжка падлічыць, установа з'явілася яшчэ за сацыялістычным часам, што добра характарызуе гісторыю сучаснага мастацтва Польшчы: там яно ніколі не ўспрымалася як нейкая "ідэалагічна чужародная з'ява". Цягам дваццаці гадоў цэнтрам кіраваў знакаміты польскі мастацтвазнаўца і тэатральны дзеяч Войцэх Крукоўскі, які летась адышоў у іншы свет. У значнай меры, менавіта ён паўплываў на станаўленне ўстановы.

Фактычна ад моманту заснавання цэнтр узяў на сябе не толькі выставачныя, але і прынамсі музейныя функцыі: пры ім заснаваны Цэнтр навуковай інфармацыі і дакументацыі, вядзецца збор уласнай калекцыі. Працуе публічная бібліятэка і досыць прыстойная кнігарня, куды трапляюць тэматычныя выданні ці не з усяго свету. Не так даўно заснавана і ўласная рэзідэнцыйная праграма для мастакоў. Варта адзначыць, што ўсёй гэтай размаітай дзейнасцю займаецца досыць вялікі штат — пад сотню асобаў без уліку тэхперсанала.

Ад пачатку працу цэнтра фінансуе Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Польшчы, што, аднак, не перашкаджае ўстанове знаходзіць дадатковыя крыніцы грашовых паступленняў. У ліку апошніх — не толькі спонсары і замежныя фонды, але таксама і кавярні (іх тут размешчана некалькі) ды арэнда памяшканняў пад самыя разнастайныя падзеі: ад навуковых канферэнцый да паказаў моды і карпаратываў.

Лакацыя

Шыкоўны барочны палац, дзе размешчаны Цэнтр сучаснага мастацтва, мае даволі пакручастую гісторыю. Летняя рэзідэнцыя польскіх каралёў, збудаваная напрыканцы XVI стагодзя Аўгустам II, пасля падзелу Рэчы Паспалітай пераўтварылася ў казармы, а неўзабаве ў вайсковы шпіталь. У вайну будынак моцна пацярпеў, і ягоныя парэшткі ў 1952 годзе былі знесены (нетыповы выпадак для Варшавы). Але праз дваццаць гадоў варшавякі "адумаліся" і адбудавалі ўсё наноў. З аўтэнтычнага тут, натуральна, адны сутарэнні.

Замак Уяздоўскі знаходзіцца наўзбоч ад цэнтра горада — але ў крокавай ад яго даступнасці. Вакол палаца — шматлікія паркі, нядрэнна адноўленыя "пад даўніну", зусім непадалёк — знакамітыя Лазенкі... Адным словам, мясціны ціхія, але даволі рэспектабельныя. Перыядычна мастацкія творы выстаўляюцца непасрэдна ў паркавай зоне. У іх ліку можна прыгадаць, скажам, "Палацы для птушак" беларуса Артура Клінава.

Адпаведная рэспектабельная атмасфера падтрымліваецца і ўнутры. Выставачныя залы поўняцца досыць старамоднымі наглядчыкамі паважнага веку, якія пільна цікуюць за кожным наведвальнікам. Не ведаю, чым абумоўлена такая мода на Захадзе і чаму яна тычыцца перадусім менавіта сучаснага мастацтва, бо ў кансерватыўных музеях атмасфера больш разняволеная. А калі тых наглядчыкаў становіцца больш за наведвальнікаў (што, па-мойму, тут не рэдкасць), сюррэалістычны эфект шматкроць узмацняецца.

Экспазіцыя

Гістарычныя інтэр'еры палаца было вырашана не аднаўляць, таму ўнутры ён уяўляе з сябе класічны галерэйны "белы куб". Умела выкарыстоўваючы прастору і сучаснае абсталяванне, дызайнеры экспазіцыі прымушаюць выйгрышна "загучаць" нават тыя творы, якія ў іншых варунках выглядалі б не надта пераканаўча. Балазе, і прасторы і абсталявання тут не бракуе...

Выставачную палітыку вызначае галоўны куратар — свайго кшталту мастацкі кіраўнік цэнтра. Варта адзначыць, што карэктаваць яго дзейнасць можа грамадская рада з дзеячаў польскай культуры.

У большасці выпадкаў, залы цэнтра аддаюцца не "перспектыўнай моладзі", але ўжо спраўджаным творцам, і досыць рэдка камусьці з іх бывае менш за пяцьдзясят. Выключэннем з'яўляецца праект аднаго з польскіх банкаў, які ўжо некалькі гадоў рэалізуецца на пляцоўцы цэнтра і прызначаны для рэпрэзентацыі творчасці маладых. Раз-пораз надараюцца вялікія праекты, што выяўляюць "зрэз" актуальнага мастацтва пэўнай краіны (некалі, за дзедам-шведам, экспанавалася і Беларусь).

Гадоў пятнаццаць таму даводзілася наведваць тут выстаўкі такіх "монстраў", як Марына Абрамавіч, Джэймс Тарэл, Рэбека Хорн... Адпаведна, патрапіўшы ў цэнтр, "неафіт" меў усе магчымасці зразумець, чым жа ёсць сучаснае мастацтва ў лепшых сваіх праявах. Выстаўкі, якія адбываюцца ў Замку літаральна цяпер, наўрад ці б далі рады справіцца з гэтай функцыяй.

77-гадовы класік польскага перформанса і фота-арта (ці "класічка", бо яна ж феміністка) Наталля ЛЛ выяўляе звыклыя бакі сваёй творчасці — постмадэрнісцкую іронію ў дачыненні да міфалагічных сюжэтаў, якія зрошчваюцца з маскультурнымі вобразамі. Іншая тэма аўтаркі — сексуальнасць. Некаторыя яе працы пагэтуль досыць цяжка ўявіць у беларускіх дзяржаўных арт-інстытуцыях. Прыкладам, відэапраект "Спажывецкае мастацтва", дзе Наталля ЛЛ здзекуецца з клішэ "дарослых фільмаў". На цэтліку дата стварэння — 1973 год. Сапраўды, класіка... Застаецца толькі "з павагай прайсці міма".

Другая выстаўка — "Habitat" ("Арэал бытавання") Катажыны Юзэфовіч — выглядае куды менш прэтэнцыёзна і, мабыць, таму спадабалася болей. Аўтарка стварае дываны, абрусы ды іншыя дзіўныя творы ДПМ з драбнюткіх кавалкаў газет і рэкламных улётак — загалоўкаў, тысяч дбайна выразаных партрэтаў і г. д. І яе карпатлівая ручная праца (гэта ж колькі трэба было шчыраваць нажніцамі) нібы пераўвасабляе адчуджаны свет медыяпрасторы ва ўласны.

Праграма

Апрача выставак, у цэнтры адбываюцца дзясяткі імпрэз. Ёсць тут кінатэатр, які штодня дэманструе актуальнае незалежнае кіно, праходзяць канцэрты, тэатральныя паказы і перформансы... У цёплую пару розныя падзеі ладзяцца ва ўнутраным дворыку, які не так даўно займеў глыбока ненавісны ўсім "пурыстам ад рэастаўрацыі" хайтэкаўскі шкляны дах.

Адукацыйная праграма ўражвае размаітасцю: яна ахоплівае ці не ўсе ўзроставыя катэгорыі — ад трохгадовых дзетак і да пенсіянераў. Прычым гутарка вядзецца зусім не толькі пра банальныя заняткі па маляванні. Прыкладам, падчас аднаго з варштатаў малечы прапануецца маляваць гукі і маляваць гукамі. Незразумела толькі, як дзіцячыя "анімаваныя шпацыры" па выстаўцы суадносяцца з тымі артэфактамі, што былі апісаны вышэй.

Рэзюмэ

Можна амаль не сумнявацца ў тым, што падобная ўстанова ў нас бліжэйшым часам не паўстане. Прычым справа не толькі ў грошах. Узважанае і спакойнае стаўленне да сучаснага мастацтва як да звыклай часткі культурнага ландшафту наўрад ці выпрацуецца ў нашым грамадстве ў бліжэйшыя гадоў -нацаць. Больш за тое, празмерная рэспектабельнасць антуражу выклікае хіба нервознасць удзельнікаў працэсу і гледачоў як гэта ўжо было з вялікімі выстаўкамі ў "БелЭкспа". Айчынны дыскурс куды больш імпульсіўны і палымяны — хаця б таму, што проста малады. А Замак Уяздоўскі — гэта пакуль далёкая ад сучасных беларускіх мастакоў пенсія. К

Што да сямейнага чытання…

меркаванне

Ілона САРОКІНА,
дырэктар Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна

Не так даўно наведала бібліятэкі Берліна. І вось што мяне ўразіла. Па-першае, за мяжой шмат увагі надаецца працы з моладдзю і дзецьмі. Мэта — прывучыць малеч і падлеткаў да чытання кніг на паперы. Бо, на жаль, цяга да традыцыйнай кнігі сёння зніжаецца як у Беларусі, так і ва ўсёй Еўропе. Таму немцы, да прыкладу, часта прапануюць у бібліятэках кнігі-раскладанкі з музычным суправаджэннем, кнігі-маляванкі, кнігі-гульні, каб зацікавіць дзяцей.

ГЕРМАНІЯ

І там сёння ніхто не адмаўляецца ад друкаваных выданняў, нягледзячы на тое, што ў нямецкіх бібліятэках можна за грошы пакарыстацца і электроннымі базамі, і набыць алічбаваную копію той або іншай кнігі, і ўзяць на дом упадабанае выданне, і спампаваць ды пакарыстацца некаторы час любым кніжным тэкстам… Напрыклад, чытацкі білет, які каштуе ад 10 да 20 еўра ў залежнасці ад узроставай катэгорыі, дае магчымасць цэлы год наведваць любыя бібліятэкі Берліна і карыстацца ў іх як рознымі бясплатнымі, так і платнымі паслугамі.

Таксама ў бібліятэках Германіі вельмі вялікую ўвагу надаюць сямейнаму чытанню, таму ў іхніх установах можна сустрэць як дарослых, так і дзяцей, якія прыходзяць кожны па сваю кнігу ў адзін і той жа будынак. Гэта, так бы мовіць, бібліятэка сямейнага тыпу або сямейнага чытання… І, як падаецца, тое — вельмі правільны падыход. Да прыкладу, мы летась адкрылі ў будынку сваёй установы, на другім паверсе, вялікі юнацкі аддзел… Кнігі там размяшчаюцца ў адкрытым доступе, там можна сядзець на банкетках або нават ляжаць на пуфіках і чытаць упадабаную кнігу, там ёсць бясплатны Wi-Fi, доступ да Сеціва са стацыянарных камп'ютараў, ладзяцца ў аддзеле шматлікія акцыі і мерапрыемствы… Таму падлеткаў тут заўсёды багата…

Акрамя таго, на маю думку, у Беларусі варта было б пераняць еўрапейскія падыходы да арганізацыі чытання для розных катэгорый насельніцтва. А для гэтага, магчыма, трэба распрацаваць і ўвесці ў дзеянне дзяржаўную праграму па развіцці дзіцячага і сямейнага чытання… Бо толькі тады, калі маленькі хлопчык ці дзяўчынка будуць чуць з вуснаў сваіх бацькоў словы казкі або цікавай кніжкі, тады ім і перадасца любоў да чытання. Але гэтага ніколі не будзе, калі бацькі самі не вельмі ахвочыя да кнігі…

Яшчэ адна цікавая рэч, упадабаная мной у Германіі: аказваецца, там здаўна існуюць і актыўна выкарыстоўваюцца бібліобусы. Гэтыя машыны ездзяць па ўсіх раёнах, заязджаюць ва ўсе сельскія паселішчы… Прычым, яны бываюць у населеных пунктах не раз на месяц, як у нас, а раз на два тыдні!

Самае цікавае, што гэтыя аўтабібліятэкі выпускаюцца на заводах ужо прыстасаванымі для выкарыстання ў бібліятэчнай галіне. Таму ў такіх "бібліятэках на колах" ужо ўсталяваны стэлажы, там ёсць месца для работніка, для яго ноўтбука, знойдзецца і дзе пакласці кніжкі. У саміх жа паселішчах для мабільных устаноў культуры існуюць спецыяльныя стаянкі, на якіх абазначаны час прыбыцця і працы аўтабібліятэк… І самае цікавае, што жыхары актыўна прыходзяць туды, каб здаць ці ўзяць у карыстанне выданні…

Так што наш беларускі шлях да ўкаранення бібліобусаў на сяле — практыка, распачатая яшчэ за савецкім часам адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны, — як я лічу, сябе цалкам апраўдвае… Варта толькі паклапаціцца пра распрацоўку і выпуск спецыялізаваных аўтамабіляў, прыстасаваных пад патрэбы бібліятэкараў… Бо, на жаль, як бы нам таго не хацелася, а працэс аптымізацыі бібліятэчных устаноў у Беларусі абавязкова будзе працягвацца. Таму за такімі "бібліятэкамі на колах", на мой погляд, сёння будучыня і рэальныя перспектывы…

Занатаваў Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Прэзентацыя выдання "Францішак Багушэвіч. Выбраныя творы" адбылася ў бібліятэцы імя класіка літаратуры.

Фатаграфічная калекцыя

Уладзімір Каратке́віч і Зінаіда Мажэйка.

Пасля Мажэйка

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў адбыўся "круглы стол", прысвечаны памяці слыннага айчыннага этнамузыколага і антраполага Зінаіды Мажэйкі, якой не стала летась. Да гэтай падзеі яе калегі і вучні гарталі альбомы і пераглядалі кадры з фільмаў пра беларускія традыцыі, створаныя пры ўдзеле даследчыцы.

Тонежскія спевакі.



Адзін з улюбёных герояў Мажэйка — Міхась Баскоў.

Кадры з фільмаў, створаныя з удзелам Зінаіды Мажэйка.



Сцяпан і Марыя Дубейкі на этнаграфічным канцэрце.

Зінаіда Мажэйка пад час здымак фільма.

Вось ужо чвэрць стагоддзя я працую ў Раённым краязнаўчым музеі, і амаль кожны дзень прыносіць новыя ўражанні і знаходкі. Часам у выніку пошукавай працы ўдаецца знайсці каштоўныя матэрыялы, якія распавядаюць пра цікавыя эпізоды з гісторыі Карэліч і раёна. Імкнуся пазнаёміць з імі наведвальнікаў праз выстаўкі. Часта з'яўляюцца ўнікальныя экспанаты не толькі з Беларусі, але і з замежжа. Шмат дакументаў было адшукана ў Нацыянальным архіве рэспублікі, некаторыя фотаздымкі захоўваліся ў сямейных альбомах землякоў. Адзін з такіх артэфактаў пераносіць нас у пачатак мінулага стагоддзя. Знаёмцеся: перад вамі начальнік карэліцкай пошты Павел Антонавіч Богуш.

Павел Богуш. Пачатак XX стагоддзя.

Фацінія Мачульская. 1906 год.

Тры здымкі з Карэлічаў

Лёсы, адкрытыя фотаальбомамі

Аднавіць яго біяграфію сёння даволі складана. Вядома, што нарадзіўся ён у Карэлічах у 1860 годзе. У пачатку мінулага стагоддзя Павел Богуш быў начальнікам паштова-тэлеграфнага аддзялення ў Карэлічах. З тых часоў захаваўся цікавы дакумент — спецыяльны страхавы поліс Таварыства страхавання жыцця Злучаных Штатаў Амерыкі, афармлены праз адпаведныя службы ў Санкт-Пецярбургу, з якога вынікае, што Павел Антонавіч у 1901 годзе застрахаваў сваё жыццё на 1 000 рублёў (на пачатку мінулага стагоддзя конь каштаваў 100 — 200 рублёў, пуд жыта — 80 капеек, дзесяціна зямлі — 100 — 120 рублёў). Яшчэ адзін дакумент — чарцёж ходу пошты па Мінскай паштова-тэлеграфнай акрузе, якім наш зямляк неаднаразова карыстаўся на службе.

Паштмайстар Павел Богуш добрасумленна выконваў свае службовыя абавязкі, праз яго рукі праходзіла ўся карэспандэнцыя, што атрымлівалі жыхары мястэчка, у тым ліку і лісты Якуба Коласа, якія паэт дасылаў настаўніцы Карэліцкага гарадскога вучылішча Аляксандры Рамановіч (Зотавай).

Была ў жыцці Паўла Антонавіча гісторыя кахання да прыгажуні Фацініі Мачульскай, якую ён лічыў сваёй нявестай. Аднойчы дзяўчына падарыла закаханаму ў яе Богушу свой здымак з дарчым надпісам: "На добрую память многоуважаемому Павлу Антоновичу от Фотинии Мочульской. 1906 года, 20 октября, м. Кореличи." На фота постаць дзяўчыны з мілавідным абліччам, якое прыгожа абрамляюць пышныя валасы. Доўгая модная сукенка падкрэслівае зграбнасць і вытанчанасць дзявочай фігуры. Затоеная ўсмешка надае твару загадкавы выгляд, а тонкая трысцінка ў руках дапамагае адчуць рухавасць асобы. Здаецца, яна прыпынілася на кароткае імгненне і вось-вось пакрочыць нам насустрач.

Сям'я доктара Лявіцкага. 1920-я.

Павел і Фацінія сябравалі, аднак, бацькі дзяўчыны аддалі перавагу не карэліцкаму мешчаніну, а мінскаму пракурору, які належаў да дваранскага саслоўя. Павел Богуш так і не змог забыць сваёй каханай, таму, відаць, і не ажаніўся. Яго жаданне мець сям'ю і дзяцей пераўвасобілася ў апякунскія клопаты: ён выхоўваў сваіх пляменнікаў.

ТЭКСТ

Святлана КОШУР,
старшы навуковы супрацоўнік Карэліцкага раённага краязнаўчага музея

Аднойчы паштмайстар наведаў фотаатэлье Калмановіча (апошні рабіў фотаздымкі не горш, чым сталічныя прафесіяналы) і атрымаў свой партрэт. (Нагадаем, першыя фотамайстэрні пачалі адкрывацца на Беларусі ў 1860-м, якраз тады, калі Павел Богуш з'явіўся на свет. Паступова майстры распачалі сваю справу і ў невялікіх гарадах ды мястэчках. А класік мастацкага фота Ян Булгак паходзіў з вёскі Асташын Карэліцкага раёна.) Люстэрка памяці дазваляе ўбачыць вочы карэліцкага паштмайстра, адчуць сур'ёзнасць і адказнасць гэтага чалавека. Умелі ж тагачасныя майстры рабіць сваю справу якасна! Таму, відаць, і не саромеліся ставіць на сваёй прадукцыі кляймо з уласным прозвішчам.

Фотапартрэты ў майстэрні Калмановіча рабіліся ў лепшых традыцыях таго часу. Абавязковы элемент — кардоннае паспарту, на якім мацаваўся здымак. Паспарту ўпрыгожвала цісненне з выявай кветак па краях. Пад здымкам — прозвішча майстра і месца стварэння партрэта. На адваротным баку надрукаваны наступны тэкст: "Фотография Я.Л. Калмановича, м. Кореличи, Минской губ." Надпіс ніжэй паведамляў: "Специальное отделение для увеличения портретов до натуральной величины и фото-эмалиров, брелки, брошки, запонки с фотографиями." Прадукцыя, як бачым, на любы густ. Прыемна даведацца, што такая майстэрня і майстар некалі існавалі менавіта ў Карэлічах, пра што апавёў унікальны фотаздымак, які захаваўся ў сям'і Ірыны Адамік.

Пазней Павел Богуш нейкі час працаваў паштмайстарам у Слуцку. Пра тое сведчыць яго разліковая кніжка, па запісах з якой можна меркаваць, што з 1911 да 1917 года яе гаспадар захоўваў свае зберажэнні ў Слуцкай дзяржаўнай ашчаднай касе. Потым наш зямляк вярнуўся да сястры Варвары ў Карэлічы, дзе зноў узначаліў мясцовую пошту.

У мястэчку людзі добра ведалі адно аднаго, і Павел Антонавіч, безумоўна, быў добра знаёмы з іншымі прадстаўнікамі мясцовай інтэлігенцыі — настаўнікамі Аляксандрам Дзянькевічам, Сцяпанам і Аляксандрай Рамановічамі. Сябраваў ён і з урачом Лявіцкім. Звесткі пра сям'ю доктара давялося наогул збіраць літаральна па крупінках. Мая цікавасць да гэтай асобы не выпадковая: у колішнім доме Лявіцкіх цяпер месціцца раённы музей, дзе я працую шмат гадоў. І вось нарэшце ўдалося знайсці аматарскія фотаздымкі, аўтар якіх невядомы. Затое вядома, што на іх адлюстраваны той шчаслівы для Лявіцкіх час, калі ўсе яны яшчэ былі разам. Сур'ёзныя твары бацькоў на адным са здымкаў і цікаўныя вочы дзяцей нібы падкрэсліваюць урачыстасць моманту — не так часта людзі здымаліся ў той час! Відавочна, здымак быў зроблены ў доме, дзе жыла сям'я.

Доктар Лявіцкі меў прыватную практыку і лячыў людзей перад Другой сусветнай вайной і ў час яе. Яго жонка, зубны ўрач, таксама дапамагала хворым. Кабінеты размяшчаліся на першым паверсе дома, а на другім жыла сама сям'я. Лёс доктара Лявіцкага склаўся трагічна. З успамінаў старажылаў вядома, што калі ў 1942 годзе яўрэйскае гета ў Карэлічах было ліквідавана, у пустых будынках пасялілі бежанцаў. Сярод іх пачалася эпідэмія тыфу. Дапамагчы хворым пагадзіўся толькі доктар Лявіцкі, які лячыў іх бясплатна. Для ўрача гэта высакародная справа закончылася трагічна: ён заразіўся тыфам і памёр. Пахавалі яго ў Навагрудку, адкуль ён быў родам. Незадоўга да гэтага сям'ю напаткала яшчэ адно гора: падарваўся на міне Янэк — сын доктара Лявіцкага. Пахавалі яго таксама на навагрудскіх могілках. Пасля смерці двух блізкіх людзей жонка доктара Лявіцкага разам з дачкой выехала ў Варшаву да сваёй маці. Пра гэтых людзей сёння нагадвае, акрамя фотаздымкаў, толькі іх колішні дом, дзе я пішу гэтыя радкі.

Міжнародны дзень тэатра ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі правядуць з **тэатральнай майстэрняй "Студыёзы"**.

Восем пытанняў пра будынак Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

Лініі дынамікі і драматызму

Карэспандэнт "К" прысутнічаў на экскурсіі па Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якую аўтар праекта будынка Віктар Крамарэнка ладзіў для калег-архітэктараў. Беручы да ўвагі спецыфіку аўдыторыі, Віктар Уладзіміравіч прамаўляў пра асаблівасці праектавання і ўзвядзення ўнікальнага аб'екта. Але паколькі новае ўвасабленне музея на сталічным праспекце Пераможцаў — частка гісторыі краіны, мы палічылі вартым азнаёміць чытачоў з некаторымі развагамі аўтара праекта ў фармаце "ўсё, што вы хацелі ведаць, але не мелі магчымасці пра тое спытаць".

Занатаваў Пётра ВАСІЛЕЎСКІ



Дынамічнае прадстаўленне ваеннай тэхнікі.

Прыклад выкарыстання бразільскага сланца ў аздобе інтэр'ера.

За такую канструкцыю купала Залы Перамогі ўзяліся не ўсе выканаўцы. / Фота на паласе — Таццяны МАТУСЕВІЧ

Экспазіцыя стваралася на аснове дзейнай у старым будынку.

Што азначае экстэр'ер будынка?

— Абеліск "Мінск — горад-герой" і будынак музея ўтвараюць адзіны комплекс. Будынак складаецца з некалькіх сегментаў, а ўсе восі сыходзяцца на абеліску. Тое дазволіла "сціснуць" галоўны фасад і зрабіць яго сумаштабным наяўнай вертыкалі і скульптуры. Гэтая канцэнтрацыя ўсіх ліній на аб'ект, які сімвалізуе пераможнае завяршэнне Другой Сусветнай вайны, увасабляе ідэю руху да Перамогі, што пачаўся з першага дня вайны.

Чаму нахілены сцены?

— Нахіленыя сцены надаюць дынамікі, драматызму і настройваюць наведвальнікаў на ўспрыманне экспазіцыі. Рэалізацыя гэтай ідэі атрымалася нялёгкай. Калі контуры з металічных сцен ужо пачалі праяўляцца, узнікалі ідэі выраўняць сцены. Але на той момант нахіленыя канструкцыі ўжо ўзвялі.

Ці дастатковыя плошчы музея?

— Музей спланаваны так, што экспазіцыя можа змяняцца, дапаўняцца. Прастора дазваляе. Сённяшняя экспазіцыя створана на базе наяўных фондаў і экспанавання, што існавала ў старым будынку. Але недзе ў балоце ляжыць танк або самалёт, якія трэба дастаць і адрэстаўраваць, а потым яны змогуць трапіць у экспазіцыю — у будынку музея ці на прылеглай тэрыторыі. Так музей зможа развівацца, насычацца артэфактамі. Будынак мае плошчу, закладзеную ў праект. Але мы прадугледзелі тэрыторыю для пашырэння. Там з'явіцца экспазіцыя пад адкрытым небам. Але з часам можна ўзвесці і пабудовы.

Якія матэрыялы скарыстаны ў аздобе?

— У інтэр'ерах асноўны матэрыял — гіпсакардон. Нахіленыя сцены выкананы з аквапанэляў, матэрыялу да яго падобнага, але гэта — цэментны кампазіт, які дазваляў працаваць бясшоўным метадам: сцены, так бы мовіць, дыхаюць. У інтэр'ерах там, дзе гэтага патрабуе вобразны лад, тынкоўка зроблена ў лёгкай дымцы. Гэты варыянт праходзіў не надта лёгка, не ўсе разумелі задуму. У аздобе ж сцен інтэр'еру скарыстаны бразільскі сланец. У ім ёсць натуральная іржа, і гэта пасуе ваеннай тэме. Была прапанова сэканоміць — узяць больш танны кітайскі граніт. Аднак праекціроўшчыкі здолелі, хоць было і нялёгка, пераканаць замоўцаў прыдбаць менавіта бразільскі сланец.

Некаторыя камунікацыі будынка "зашытыя" ў столь. Такая акалічнасць прымусіла шукаць нестандартнае рашэнне — каб атрымалася і функцыянальна, і па-мастацку. А яшчэ — каб трубы закрыць ды на ваенную тэму вобразна спрацаваць.

Віктар КРАМАРЭНКА.

Зала Перамогі: выгляд з глядзельнай пляцоўкі пад купалам.

Пераход паміж экспазіцыйнымі блокамі.

Фрагмент экспазіцыі.

Прыклад выкарыстання экрана.

Ліфт і лесвіца — пераход да Залы Перамогі.

Дэманстрацыя авіятэхнікі.

Ці апраўданы інтэрактыў?

— Можа і нясціпла гэта згадваць, але ад расійскіх калег я чуў, што наш музей пераўзыходзіць аналагічны маскоўскі не столькі па маштабах, як па сіле ўздзеяння. У іх, скажам, калі ёсць танк, дык ён стаіць на паркеце. Праз гэта успрымаецца музейнай рэччу. Мы ж пры экспанаванні ваенных артэфактаў імкнуліся ўзнавіць для іх асяроддзе той пары, зымітаваць баявыя сітуацыі. І людзі са зброяй, і баявая тэхніка ў нас ні "пад шклом", а нібыта ў дзеянні.

Лічу, што выкарыстанне інтэрактыву ў сучасным музеі — метад, які дазваляе найбольш поўна раскрыць тэму. Гэта рознае ўспрыманне, калі танк стаіць на згаданым вышэй паркеце і на імітаваным балоце, дзе фонам служыць вялікі экран: там баявая машына прадстаўлена ў дзеянні. Адразу адчуваеш, якая гэта страшная з'ява — вайна. Паводле назіранняў, падачу матэрыялу ўхваляюць і ветэраны, і людзі маладога веку.

На стадыі фарміравання канцэпцыі правялі тэндар. Яго выйграла польская фірма, якая мела досвед праектавання музеяў вайны. Эскізная канцэпцыя выконвалася з прыцягненнем супрацоўнікаў музея і, зразумела, архітэктараў.

Чаму ўваход у музей не ля стэлы?

— Цэнтральны ўваход планаваўся з боку абеліску "Мінск — горад-герой". Традыцыйная схема: парадны фасад — галоўны ўваход. Як у тэатры: заходзіш, спускаешся ў гардэроб, а потым падымаешся ў фае. Але ўваход, у выніку, зрабілі ўнізе, беручы да ўвагі зручнасць для ветэранаў, каму рэзкія пераходы ўніз-уверх могуць скласці праблему. Такім чынам, наведвальнікі трапляюць у музей з ніжняй пляцоўкі. Там і паркоўка. Далей павольна (падкрэслю, павольна) падымаюцца на паверхі. Зрэшты, ёсць ліфт, маецца і панарамны ліфт, спецыяльныя сродкі перасоўвання ў Залу Перамогі. Усё зроблена, каб людзям было зручна.

Як рабіўся купал?

— Генеральным праекціроўшчыкам на будаўніцтве музея быў Дзяржаўны інстытут "Мінскграда". Пад ягонай эгідай працавалі прыватныя фірмы. Скажам, адна з іх працавала па ўсіх канструкцыях, акрамя купала Залы Перамогі. Наогул, па купале было дзве прапановы: канструкцыя з прамавугольнай сеткі (так бы мовіць, першая рэдакцыя) і дыяганальная канструкцыя, якая мусіла надаць купалу індывідуальныя рысы. Апошнюю згаданы выканаўца зрабіць не здолеў, заявіўшы, што гэта немагчыма. Тады я прыцягнуў да працы канструктараў, маіх знаёмых — італьянцаў, немцаў і нашых — брэстчан. Усе тры групы разлічылі па архітэктурнай схеме канструкцыі і сказалі, што яны рэальныя. А перамаглі ў тэндары землякі. Менавіта яны, пад кіраўніцтвам Вячаслава Драгана, які выконваў у Віцебску разлікі па Летнім амфітэатры, справіліся з задачай. Асабіста мне хацелася, каб канструкцыю зрабілі з нержавеючай сталі, але выбралі чорную сталь.

Што не ажыцявілі ?

— Не ўсе ідэі праекта музея атрымалася ажыццявіць. Так фасад музея бачыўся мне выкананым з нержавеючай сталі. Прычым нержавейка мусіла быць крыху памятай. У міжнароднай практыцы гэта не з'яўляецца чымсьці новым. Такі прыём часта скарыстоўваюць ва ўнікальных аб'ектах. Ён вельмі пасаваў бы і тут… Не ўсё ўдалося рэалізаваць у інтэр'ерах. Напрыклад, каб не экран на сцяне (як зараз), а ўся сцяна — экран. Немалых намаганняў каштавала "выбіць" нержавеючую сталь для пілонаў галоўнага фасада. Дарэчы, гэта сталь заводаў Крупа, які у часе той вайны рабіў гарматы для Вермахта. У гэтай акалічнасці бачыцца сімвалізм…

К

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст." .
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст." .
Выстаўкі:
■ Выстаўка **слуцкіх паясоў** са збору Нацыянальнага музея ў Варшаве — да 6 красавіка.
■ Выстаўка **"Mater Dei. Іканаграфія аднаго кахання"** — да 3 мая.
■ Выстаўка **"Вынаходніцтвы Да Вінчы"** — да 30 красавіка.
■ Выстаўка ў рамках праекта **"Жанчына — гэта мастацтва!"** — да 30 сакавіка.
■ Выстаўка пейзажнага жывапісу рускай школы другой пал. XIX ст. **"Сучаснікі карыфеяў"** — да 8 чэрвеня.
■ Выстаўка, прысвечаная 80-годдзю Мітрапаліта Філарэта, ганаровага Экзарха ўсея Беларусі, — **"Хрысціянства і хрысціяне ў творчасці рускіх і беларускіх мастакоў XIX стагоддзя"** — да 8 чэрвеня.
■ Выстаўка твораў кітайскага мастака і каліграфа **Лян Юнхэна** — да 23 сакавіка.

Арт-кафэ
■ Выстаўка, арганізаваная Пасольствам Дзяржавы Палесціна ў Рэспубліцы Беларусь да Дня палесцінскай культуры, —**"Падарожжа па Палесціне"** — да 12 красавіка.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
Выстаўка:
■ **"Прарок свайго часу. Адам Міцкевіч. Ілюстрацыі і медалі"** — да 25 снежня.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Ад прадзедаў нам засталася спадчына"** — да 31 сакавіка.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:
■ "Старажытная Беларусь".
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".
Выстаўкі:
■ Выстаўка **"Музей шакаладу "Nikolya"** — да 12 красавіка.
■ Выстаўка **"Мастацтва рускага мадэрна. Пошукі нацыянальнага стылю"** — да 29 сакавіка.
■ Выстаўка **"Альтэрнатыўнае фота Беларусі. Сувязь часоў..."** — да 29 сакавіка.
■ Выстаўка Нацыянальнага музея гісторыі Латвіі **"Бурштын — каштоўны камень Балтыйскага мора"** — з 27 сакавіка да 24 красавіка.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а.
Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыя:
■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езда РСДРП".
Выстаўкі:
■ **"Вікінгі і балты: паўночная сага"** — да 12 красавіка.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:
■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
Выстаўка:
■ **"Экзатычны свет"** — да 20 чэрвеня.

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 9А.
Тэл.: 237 46 94.
■ Выстаўка **"Чароўныя матылькі"** — да 23 мая.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:
■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".
Кінапраграмы:
■ Рэтраспектыва да 85-годдзя з дня нараджэння артысткі Лаліты Торэс **"Аргенцінскі феномен"** — з 4 да 27 сакавіка.
■ Рэтраспектыва да 105-годдзя з дня нараджэння кінарэжысёра Акіры Курасавы **"Імператар японскага кіно"** — з 5 да 29 сакавіка.
■ Рэтраспектыва **"Беларуская мультпанарама. 40 гадоў на экране. Частка 13"** — з 7 да 29 сакавіка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
Выстаўка:
■ Выстаўка **"Лялька і чалавек: хто ў галоўнай ролі?"** (калекцыя з Гродзенскага абласнога тэатра лялек) — да 18 красавіка

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавіленская, 14.
Тэл.: 286 74 03.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Беларускія маляванкі"**.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка дзіцячай творчасці **"Свет без вайны"**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка твораў Сяргея Пыжыкава **"Роздумы і мроі"** — да 12 красавіка.
■ Выстаўка **"Час і рэчы. Самавары"** — да 29 сакавіка.
■ Выстаўка твораў Віталя Раковіча **"United colors of Belarus"** — да 10 мая.

Ратуша
■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Партрэты князёў Радзівілаў з калекцыі князя Канстанціна Гагенлоэ"** — да 16 чэрвеня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).
Выстаўка:
■ Выстаўка **"Аб роднай мове замоўлю слова я..."**.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыя:
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
Выстаўка:
■ Выстаўка **"На старасвецкі лад"** (мужчынскія аксэсуары XIX — XX стагоддзяў) **з фондаў Тракайскага гістарычнага музея** (Літоўская Рэспубліка) — да 14 красавіка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10.
Тэл.: 321 24 30.
■ Выстаўка скульптуры Уладзіміра Жбанава **"Ад мяне"** — да 31 мая.
■ Выстаўка работ майстроў Латвіі **"Надыходзіць час размаляваць Латвію..."** — да 29 сакавіка.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
Выстаўкі:
■ Персанальная фотавыстаўка Янака Коўзеля **"Дакрананне"** — да 29 сакавіка.
■ Выстаўка макетаў, фотаздымкаў, мультымедыя **"Гарады на грані выжывання: японскія ўрбаністычныя праекты 1960-х гадоў"** — да 29 сакавіка.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**
Выстаўка:
■ Выстаўка **"Gloria Patria"** — дакументы, карты, прадметы хрысціянскага культу з прыватнай калекцыі Ігара Сурмачэўскага — да 20 верасня.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.
Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры к. XIX — с. XX стст.

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, пр-т Ракасоўскага, 49.
Тэл.: 291 16 76.

Экспазіцыі:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Л.Шчамялёва".**
Выстаўка:
■ Калектыўная міжнародная выстаўка **"Свет без межаў"** — да 27 сакавіка.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.

Выстаўка:
■ **"Доблесць і слава. Даспехі і ўзбраенне XVI — XVII стст."** са збору майстра па даспехах Сяргея Нурматава — да 29 сакавіка.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ
г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца
Выстаўкі:
■ Выстаўка **"Анджэй Струміла. Жывапіс"** — да 22 сакавіка.
■ Выстаўка **"Беларусь у Першай Сусветнай вайне"** з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь і з прыватных калекцый — да 13 красавіка.
■ Выстаўка дагістарычных гігантаў з санкт-пецярбургскага Музея васковых фігур **"Планета дыназаўраў"** — да 3 мая.
■ Выстаўка **"Таямніцы і казкі Японіі"** — да 29 сакавіка.
■ Выстаўка **"Новыя паступленні рэчаў археалогіі"**.
■ Выстаўка работ Валерыя Ражнова, прысвечаная Міжнароднаму жаночаму дню, **"Кветкі і жанчыны"** — 22 сакавіка.

Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
■ Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца
Экспазіцыя:
■ **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.
Выстаўкі:
■ **"Гісторыя ў пісьмёнах"** (факсімільныя выданні старажытнарускіх летапісаў з аддзела рэдкай кнігі Гомельскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна) — да 12 красавіка.
■ **"Рэтра-Гомель"** — да 29 сакавіка .

Паўночнае крыло палаца
Экспазіцыя:
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.
Выстаўкі:
■ Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад
■ Свет субтрапічных раслін і жывёл.

Белая гасцёўня
■ Канцэрт **"Пад кіраўніцтвам вясны"** з удзелам Зоі Гарынай (вакал) і Алега Ананьева (гітара) — 28 сакавіка а 17-й.
■ Канцэрт **"У святле месяца..."** з удзелам лаўрэатаў міжнародных конкурсаў Валянціны Дабраволь-скай (сапрана) і Марыны Рамейка (фартэпіяна) — 24 красавіка а 19-й.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ
г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстаўка **"Яны лёс не выбіралі"** — да 20 красавіка.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.
Выстаўкі:
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ **"Крылы над Лідай"** — выстаўка да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
■ Выстаўка **"Старонкі непа-100ронняй вайны на Лідчыне"**.
■ Выстаўка **"Гукі цывілізацыі, якая заснула"**.
■ Выстаўка **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
■ Выстаўка **"З мастацкім словам па жыцці"**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Персанальная выстаўка традыцыйнага кітайскага жывапісу тушшу і мінеральнымі фарбамі Марыны Эльяшэвіч **"За кітайскай сцяной"**.
■ Выстаўка з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту кан. XIX — пач. XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстаўка Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея **"Мураваныя замкі Гродзеншчыны XVI — XVII стст. па матэрыялах археалагічных даследаванняў"**.
■ Выстаўка **"Вясельны пярэпарах"** — з 27 да 29 сакавіка.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

■ Выстаўка **"Ступені"**, падрыхтаваная сумесна з Беларускім грамадскім аб'яднаннем фотамастацтва — з 27 сакавіка да 10 красавіка.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.
■ **24 — "Прыхільнікі"** — тэатралізаваны гумарыстычны вечар вакальнай і інструментальнай музыкі.
■ **25, 26 — "Царская нявеста"** (опера ў 2-х дзеях) М.Рымскага-Корсакава.
■ **27 — "Жызэль, або Вілісы"** А.Адана. Пачатак а 19-й.
■ **27 — "Да вяршыняў майстэрства"** — Музычныя вечары ў Вялікім (Камерная зала імя Л.П. Александроўскай). Пачатак у 19.30.
■ **28 — "Тры парсючкі"** (балет у 2-х дзеях) С.Кібіравай. Пачатак а 12-й.
■ **28 — "Яўгеній Анегін"** П.Чайкоўскага. Пачатак а 19-й.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Энгельса, 7.
Тэл./факс: 327 60 81.
■ **21, 22 — "Чайка"** А.Чэхава.
■ **24 — "Не мой"** А.Адамовіча.
■ **25 — "Сымон-музыка"** Якуба Коласа.
■ **26 — "Людзі на балоце"** І.Мележа.
■ **27 — "Вечар"** А.Дударава.
■ **28 — "Паўлінка"** Янкі Купалы.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.
■ **24 — "Адзін у квадраце"** (танцавальны перформанс) тэатра "KARAKULI".
■ **25 — "Адамавы жарты"** С.Навуменка.
■ **26 — "Воўк-мараплавец"** С.Казлова. Пачатак аб 11-й.
■ **26 — "Белы анёл з чорнымі крыламі"** Д.Балыка. Пачатак а 19-й.
■ **27 — "Фінт-Круазэ"** Д.Багаслаўскага, В.Красоўскага.
■ **28 — "Усе мышы любяць цырк"** В.Буслаевай. Пачатак а 12-й.
■ **28 — "Нязваны госць"** С.Бартохавай. Пачатак а 19-й.
Гастролі Гомельскага гарадскога маладзёжнага тэатра:
■ **21, 22 — "Дзень народзінаў Ката Леапольда"** А.Хайта. Пачатак а 12-й.
■ **21 — "Аскар і Ружовая дама"** Э.Шміта.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР
г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.
■ **21 — "Шчаўкунок"** П.Чайкоўскага. Пачатак у 11.30.
■ **21 — "Мая жонка — ілгуння"** В.Ільіна, В.Лукашова. Пачатак а 19-й.
■ **22 — "Жызэль"** А.Адана.
■ **24 — "Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.
■ **25 — "Юнона" і "Авось"** А.Рыбнікава.
■ **26 — "Асоль"** У.Саўчыка. Пачатак у 11.30.
■ **26 — "Шклянка вады"** У.Кандрусевіча. Пачатак а 19-й.
■ **28 — "Бураціна.BY"** А.Рыбнікава. Пачатак у 11.30.
■ **28 — "Шалом алейхем! Мір вам, людзі!"** А.Хадоскі. Пачатак а 19-й.
Гастролі Даўгаўпілскага тэатра (Літва):
■ **27 — "Дамскі рай"** Р.Паўлса.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **21 — "Тук-тук! Хто там?"** Л.Ралчава. Пачатак а 11-й.
■ **22, 27 — "Брэменскія музыкі"** В.Ліванава і Ю.Энціна. Пачатак у 10.30 (27) і аб 11-й (22).
■ **25 — "Дзядзька Ваня і тры сястры"** Ю.Пахомава. Пачатак а 18-й.
■ **26 — "Марозка"** М.Шурынава. Пачатак ў 10.30.
■ **28 — "Ямелева шчасце"** па матывах рускіх народных казак. Пачатак аб 11-й.